Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 61 (5735) | 15 сакавіка 1937 г., панядзелак | ЦАНА 10 КАП

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

РАШЭННІ ПЛЕНУМА ЦК ВКП(б) ЗРОБІМ ЗДАБЫТКАМ КОЖНАГА КОМУНІСТА.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР — Аб спыненні вядзення спраў аб пазбаўленні выбарчых правоў грамадзян СССР па матывах соцыяльнага паходжання, маёмаснага становішча і мінулай дзейнасці і аб ліквідацыі Цэнтральнай выбарчай камісіі ЦВК Саюза ССР.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Беларускай ССР: Аб рэарганізацыі судовых органаў у акругах.

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — Вышэй сцяг большэвіцкай самакрытыкі.

Б. Саўкоў — Узорна абслугоўваць пазыкатрымальнікаў.

І. Власенка — Вопыт майстроў высокага ўраджаю ільну.

У. Кальмага — Небольшэвіцкі стыль партыйнага кіраўніцтва.

П. Кавалёў — Ворагі арудуюць пад бокам райкома комсамола.

ЗА РУБЛЯМ:

Крывавыя баі ў раёне Гвадалахары.

Пазыка нацыянальнай абароны ва Францыі.

У Лондане адкрыўся кангрэс міру і дружбы з СССР.

И. Сталин

Аўталітаграфія В. І. Шухаева.

РАШЭННІ ПЛЕНУМА ЦК ВКП(б) ЗРОБІМ ЗДАБЫТКАМ КОЖНАГА КОМУНІСТА

Расце актыўнасць комуністаў

З вялікім уздымам і цікавасцю абмяркоўваюць і вывучаюць комуністы мозырскіх арганізацый гістарычнае рашэнне пленума ЦК ВКП(б). Кожны з іх разумее важнасць гэтых рашэнняў для партыі, якая кіруе вялікай краінай Саветаў.

Праслухаўшы ўважліва рэзалюцыю пленума па дакладу тав. Жданава, комуністы пярвічнай арганізацыі мозырскага фанернага завода «Чырвоны Кастрычнік» разгарнулі актыўныя спрэчкі, выкрываючы недахопы ўнутрыпартыйнай работы на заводзе.

— Усё, што адзначана ў рэзалюцыі аб парушэннях статута партыі, унутрыпартыйнай дэмакратыі, — гаворыць комуністка Паліцкая, — поўнасцю адносіцца і да нашай партарганізацыі. За два гады ў нас змянілася 6 сакратароў парткома і амаль ні адзін з іх пры пакіданні працы на заводзе не адчытваўся перад комуністамі. Больш таго, сакратары парткомаў Радзеўскі і Блішчанка нават не былі намі абраны. Райком партыі прызначыў іх, а нам давялося толькі «аформіць».

— А вазьміце факт «выбараў» мяне ў склад парткома, — гаворыць старшыня заўкома комуністка Шульман. — Не паспела я прыехаць на завод, як партком адразу ўвёў мяне ў свой склад.

Гаварылі комуністы і аб тым, што на заводзе груба парушаецца профсаюзная дэмакратыя, што заўком і цэхавыя прафоргі ніколі не адчытваюцца за сваю работу.

— Наш парторг Абрамаў, — гаворыць комуніст Валасюк (партарганізацыя Слабодскага сельсавета) — амаль цэлы год не адчытваўся на партыйным сходзе. Мы яго абралі, а правяраць яго работу былі пазбаўлены магчымасці. Хіба гэта не з'яўляецца прамым парушэннем унутрыпартыйнай дэмакратыі? Хіба гэта не ёсць ушчамленне правоў радавых комуністаў?

Комуніст Дзядок дапаўняе Валасюка. Ён гаворыць аб тым, што такая практыка работы паралізавала сямейнасць, комуністы не крытыкавалі адзін аднаго, хоць і ведалі пра недахопы ў рабоце.

— Узяць к прыкладу нашага парторга, — працягвае тав. Дзядок. — У рэзультаце таго, што яго работу комуністы не правяралі, ён зазнаўся, перастаў працаваць з масамі, рэтазейнічае ў адносінах да класавых ворагаў. Жулікі і прайдзісветы, якія акапаліся ў калгасе, апукалі Абрамава ў пытаннях уліку кармоў. Жывёла зараз у калгасе асталася без сена.

Асобныя комуністы, як старшыня калгаса «Калгаснік Мазыршчыны» тав. Рафальскі страцілі усякае партыйнае і палітычнае чуццё. Заняўся п'янкай, замест палітработы з калгаснікамі, ён стаў на шлях адміністравання, прымяняючы марадзёрскія штрафы.

З вялікім задавальненнем сустрэлі комуністы рашэнне пленума аб выключэнні з партыі Бухарына і Рыкава — гэтых заўзятых ворагаў народу, прэзрэнных рэстаўратараў капіталізма.

Партыйныя сходы, на якіх абмяркоўваюцца і вывучаюцца рэзалюцыі пленума, адбыліся ва ўсіх пярвічных арганізацыях Мозыра. У большасці арганізацый абмеркаванне рэзалюцыі пленума праходзіць пад знакам разгортвання большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі, пад знакам выкрыцця недахопаў партыйнай работы.

Аднак, у асобных арганізацыях абмеркаванне гэтага важнейшага гістарычнага дакумента звялі да абстрактных разважанняў аб недахопах партыйнай работы ўвогуле. Аб недахопах-жа сваёй работы яны гаварылі вельмі мала. Прыкладам такога «абмеркавання» могуць служыць партыйныя арганізацыі горсовета і райвыканкома.

Ні адзін з комуністаў пярвічнай арганізацыі РВК у сваім выступленні на сходзе не сказаў аб тым, што партыйная група прэзідыума РВК ужо больш як поўгода не збіралася. Сакратар гэтай партгрупы Буякоў нікім не абран. Ён «пакінуў» партгрупу ад былога старшыні РВК Жогава.

Р. ФРАЛОЎ.

ЗАКРЫТЫЯ ВЫБАРЫ УЗНІМУЦЬ АКТЫЎНАСЦЬ

Рашэнні пленума ЦК ВКП(б) я прачытаў і не адзін раз іх глыбока прадумаў. Закрытыя выбары кіруючых партыйных органаў патрабуюць вялікай адказнасці кожнага комуніста перад нашай партыяй.

Што было раней? Вось вазьму нашу арганізацыю. Яна малалікая. Да выбараў сакратара парткома я, як і многія комуністы нашай арганізацыі, адносіліся абыякава, слепа. Напрыклад, былога сакратара парткома Гарбаўцова нам парэкамендаваў райком партыі. Ну што гаварыць, работнік здавалася-б добры і ўсе галасавалі на агульным сходзе, хаця і не ведалі, што ён прадстаўляе з сябе. А як потым аказалася, Гарбаўцоў комуніст непрацаздольны, на рабоце сябе не апраўдаў. Прытупіўшы большэвіцкую пільнасць, запусціў партыйную гаспадарку, і часам партыйныя дакументы знаходзілі ў буфеце. Партсходы праходзілі на нізкім палітычным узроўні, не было разгорнутай большэвіцкай самакрытыкі. У нашай арганізацыі парушаўся статут партыі: былі арганізаваны так званыя цэхавыя партгрупы, што забаронена па статуту партыі пры наяўнасці невялікай колькасці комуністаў. Сакратары парткома не адчытваліся больш года аб сваёй рабоце.

Усё гэта безумоўна зніжала актыўнасць комуністаў, яны не маглі выступаць і своечасова выкрываць недахопы работы партыйнай арганізацыі.

Закрытыя выбары партыйных органаў яшчэ вышэй узніміць актыўнасць комуністаў, і мы будзем абіраць у кіруючыя парторганы лепшых з лепшых комуністаў, бязмежна адданых справе партыі Леніна—Сталіна.

І. ПАРТНОЎ.

Брыгадзір кандытарскага цэха менскага хлебазавода.

Небывалая актыўнасць

ГОМЕЛЬ. (Кар. «Звязды»). Гэтымі днямі адбыўся агульназаводскі сход партарганізацыі станкабудаўнічага завода імя Кірава. Комуністы ведалі, што на гэтым сходзе будзе вывучацца найважнейшае пытанне — рашэнні пленума ЦК ВКП(б). Сход пачаўся ў намечаны час з поўнай яўкай ўсіх членаў партыі.

Сакратар парткома тав. Карантаер растлумачыў гістарычныя рашэнні пленума ЦК ВКП(б). Ён самакрытычна расказаў аб тых шматлікіх парушэннях статута партыі ў партарганізацыі завода. Шырока практыкавалася кааптацыя ў склад парткома. Парторг і партком ніколі не адчытваліся перад комуністамі аб сваёй рабоце.

Пасля даклада разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Выступае член партыі тав. Петухоў. У яго голасе гучыць шчырае задавальненне новым сталінскім рашэннем партыі. Задача нашай партыі, — гаворыць ён, — узначаліць новы паварот у палітычным жыцці нашай краіны. Мы, комуністы, абавязаны паставіць нашу работу так, каб абраць у кіруючыя партыйныя органы толькі тых людзей, якія адданы вялікай справе большэвіцкай партыі.

Тав. Петухоў падвяргае рэзкай большэвіцкай крытыцы работу парткома і гаркома. Ён указвае, што асабліва партком не займаўся выхаваннем комуністаў, што ён не лічыўся з воляй членаў партыі, ігнараваў інтарэсы радавых комуністаў.

— У рашэннях пленума сказана, што ўсе комуністы павінны быць перадавымі, — гаворыць т. Бейлін. Але ў нашай партарганізацыі не створаны для гэтага належныя ўмовы. Вось прыклад, калі хто з нашых комуністаў «не аратараў» выступае, яго абрываюць, напамінаючы, што кончыўся рэгламент, што ён кажа не па сутнасці ў той час, як ён хоць нямела, але расказвае аб важных справах. Мне самому вельмі цяжка ў кароткіх словах расказаць аб тым, што я думаю. І вось нашы парткіраўнікі замест таго, каб дапамагчы мне разблытаць клубок важных думак, збіваюць мяне рэгламентамі.

Тэхнарук завода, — інжынер тав. Піраго́ў, у сваім выступленні ўказвае, што комуністы-інжынеры захапіліся толькі тэхнікай і зусім забыліся, што ёй кіруюць жывыя людзі. З гэтай прычыны тэхніка на заводзе не заўсёды дае патрэбныя вынікі, бо рабочыя аказваюцца не на вышыні сучасных запатрабаванняў.

З аналагічнымі прамовамі выступаў яшчэ рад комуністаў. Усе яны гаварылі аб гістарычным значэнні пленума ЦК ВКП(б), які ўзніме справу большэвіцкага выхавання комуністаў на небывалую вышыню.

П. ЧЫКУН.

БЕЗ САМАКРЫТЫКІ НЯМА БОЛЬШЭВІЦКАЙ ПІЛЬНАСЦІ

Калі я знаёміўся з рашэннямі пленума ЦК, то адчуў вялікую сілу ўсіх мерапрыемстваў, указаных у рашэннях пленума. Зараз уся работа партыйных арганізацый будзе перабудована па-новаму. Раней пастаноўка партыйнай работы ў нашай партарганізацыі «Чырвоны тэкстыльшчык» зусім не адпавядала запатрабаванням статута партыі і прынцыпам унутрыпартыйнага дэмакратызма.

За прайшоўшых 3 гады ў нас змянілася 9 сакратароў парткома. З сакратары нават не абіраліся партыйным сходам, а кааптаваліся. Аб сваёй рабоце ў парткоме ніхто з іх не адчытваўся на агульным партыйным сходзе. Самакрытыка грубым чынам была запісчута. Былы сакратар парткома Пікус (зараз выключан з партыі, як трацкіст) на кожным кроку праследваў рэдактара насценгазеты тав. Кагэн, якая змяшчала матэрыялы ў насценгазеце аб дрэннай пастаноўцы партработы. Агульныя партыйныя сходы праходзілі вяла, без усякай актыўнасці: комуністы баяліся выступаць і крытыкаваць работу парткома.

Таму тут было гняздо трацкістаў, эсэраў, жулікаў і розных падхалімаў. Рашэнні пленума ўносяць карэнную перабудову работы партыйных органаў і, ў сувязі з гэтым на нас, комуністаў, кладзецца вялікая адказнасць штодзённа змагацца за авалоданне марксісцка-ленінскімі ведамі, ўзмацняць рэволюцыйную пільнасць. Пры закрытых выбарах быць больш актыўнымі, адчуваць адказнасць перад нашай партыяй і яе ЦК за выбары ў партыйныя органы.

І. ЛУЦУК.

Механік менскай фабрыкі «Чырвоны тэкстыльшчык».

ВЫШЭЙ СЦЯГ БОЛЬШЭВІЦКАЙ САМАКРЫТЫКІ

У большасці пярвічных арганізацый КП(б)Б зараз адбываюцца партыйныя сходы, на якіх абмяркоўваюцца рашэнні пленума ЦК ВКП(б) па дакладу тав. Жданава. Рашэнні ЦК ВКП(б) узнялі актыўнасць партарганізацый і кожнага комуніста пасобку. На партыйных сходах комуністы выкрываюць буйнейшыя недахопы, якія мелі месца ў практыцы работы партыйных арганізацый, і вызначаюць практычныя шляхі перабудовы сваёй работы.

Ужо ў бліжэйшыя дні пачынаюць праводзіцца выбарчыя партыйныя сходы, на якіх будуць абмеркаваны справаздачы партыйных камітэтаў і праведзены выбары партыйных органаў на аснове тайнага галасавання кандыдатаў. Гэты сход павінен паслужыць адпраўным пунктам у ліквідацыі тых недахопаў у партрабоце, якія адзначаны ў рашэнні пленума ЦК ВКП(б). І каб яны адыгралі гэту ролю, неабходна ўсямерна разгортваць сцяг самакрытыкі.

У практыцы работы арганізацый КП(б)Б ёсць выключна многа фактаў абураючай запушчанасці партыйна-палітычнай работы, грубага парушэння статута партыі і прынцыпаў унутрыпартыйнай дэмакратыі. Такая практыка немінуча прыводзіла да аслаблення большэвіцкай пільнасці ў арганізацыі, стварэла абстаноўку, калі ворагі народу, контрэволюцыянеры—трацкісты, зіноўеўцы, правыя, нацдэмы, пранікаючы на асобныя ўчасткі, праводзілі сваю падрыўную контрэволюцыйную работу. Аб гэтым з усёй паўнатой сведчаць факты з практыкі работы лепельскай, добрушскай, сіроцінскай і інш. партарганізацый.

Падрыхтоўка да правядзення партыйных сходаў павінна будзе забяспечыць поўнае і глыбокае выкрыццё абсалютна ўсіх недахопаў і прарываў ва ўнутрыпартыйнай рабоце. Неабходна забяспечыць ўдзел усіх комуністаў у рабоце партыйнага схода, усяляк падтрымаць большэвіцкую самакрытыку, якая пачалася зараз у радзе партарганізацый.

Ні ў якім выпадку нельга дапускаць падмены партыйнага схода параднай шумнай з повалу поспехаў, уміляючых сэрца кіраўніка партарганізацыі, але якія нічога не даюць партыі, не рушаць нас наперад. Многія партыйныя арганізацыі ў процівагу ўказанням і патрабаванням статута партыі пачалі ствараць цэхавыя партыйныя групы, перадаверыўшы ім усю работу. Замест агульных сходаў партыйныя арганізацыі ў большасці сваёй праводзілі сходы цэхавых партыйных груп, якія праходзілі на нізкім палітычным узроўні. Практыка існавання нестатутных партыйных груп да апошняга часу мела шырокае распаўсюджанне ў радзе арганізацый КП(б)Б. Ажыццяўленне задач, пастаўленых у рашэнні ЦК ВКП(б), патрабуе ад кожнай партыйнай арганізацыі неадкладнага знішчэння і спынення гэтай небольшэвіцкай практыкі.

Над арганізацыяй партыйных сходаў нам яшчэ многа прыдзецца працаваць. Неабходна, каб партыйны сход быў сапраўднай баявой школай палітычнага выхавання комуністаў. На сходах трэба ставіць не толькі агульныя пытанні палітыкі, але і баявыя пытанні партарганізацыі. Нельга сказаць, што мясцовыя пытанні ў нас не ставяцца. Яны бываюць, але зводзяцца часцей за ўсё да дробных гаспадарчых пытанняў. Трэба ставіць баявыя пытанні жыцця партарганізацыі, выхоўваць на іх людзей.

«Роля агульных партыйных сходаў, — гаварыў тав. Жданаў на пленуме ЦК ВКП(б), — прыніжана. У радзе арганізацый агульнапартыйныя сходы збіраюцца рэдка, пытаннямі мясцовага партыйнага жыцця займаюцца мала.

Парушэнне асноў унутрыпартыйнай дэмакратыі сказваецца і на падрыхтоўцы партыйных сходаў, калі члены партыі не ведаюць папярэдне, якія пытанні будуць абмяркоўвацца».

У паралку падрыхтоўкі да партыйных сходаў у радзе партарганізацый Менска, Віцебска, Гомеля створаны шматлікія самаправерачныя брыгады. Няма патрэбы даказваць, што гэта з'яўляецца бюракратычным кручкатворствам, якое наўрад-ці можа садзейнічаць разгортванню большэвіцкай самакрытыкі. Не надуманыя брыгады, а ўсе комуністы на партыйным сходзе павінны правяраць і крытыкаваць работу парткомаў. Узмацняць актыўчасць усіх комуністаў, разгортваць большэвіцкую самакрытыку ў арганізацыі, уцягваць усіх членаў партыі у актыўнае абмеркаванне пытанняў парадку дня — вось пярвейшая і адказнейшая задача. Гаркомы і райкомы павінны неадкладна ліквідаваць створаныя брыгады па самаправерцы, шырока растлумачваючы комуністам іх правы і абавязкі.

Трэба пакончыць і з такой практыкай, калі на партыйны сход прыходзяць з папярэдне падрыхтаванай рэзалюцыяй, калі думкі і выказванні комуністаў не ўлічваюцца. З такой практыкай, якая па сутнасці з'яўляецца праяўленнем найвялікшай непавагі да законных правоў члена партыі, трэба неадкладна пакончыць. Трэба, каб рашэнні па пытаннях, якія стаяць на парадку дня партсходу, адпавядалі тым прапановам, якія ўносяцца комуністамі непасрэдна на партыйным сходзе.

Пасля абмеркавання справаздачы комуністы прыступяць да выбараў на аснове тайнага галасавання. Гэта сістэма выбараў яшчэ вышэй узніме самакрытыку і будзе спрыяць выбару ў партком найбольш аўтарытэтных, праверaных па рабоце, культурных комуністаў, сапраўдных вожакоў мас. «Сам працэс выбараў будзе, відаць, падзелен на дзве стадыі. Першая стадыя, калі ідзе зусім адкрытае абмеркаванне кандыдатур. Кожны мае права называць і адстайваць любую кандыдатуру ў абраемы партыйны камітэт. Гэта першая стадыя. Потым абмеркаваныя кандыдатуры галасуюцца шляхам зачынятага галасавання». (Жданаў).

Неабходна, каб усе названыя комуністамі кандыдатуры былі абмеркаваны, уважліва выслуханы ўсе адводы, а таксама станоўчыя водзывы, калі іх пажадаюць выказаць, ні ў якім выпадку не абмяжоўваць спрэчак па гэтаму пытанню. Пасля сканчэння спрэчак павінна пачацца галасаванне. Пленум ЦК ВКП(б) забараніў «пры выбарах парторганаў галасаванне спісам. Галасаванне праводзіць па асобных кандыдатурах, забяспечыўшы пры гэтым за ўсімі членамі партыі неабмежаванае права адводу кандыдатаў і крытыкі апошніх».

Значыцца, тайна галасавацца павінна кожная названая кандыдатура, а не цэлы спіс.

Няма сумнення, што справаздачна-выбарчыя сходы яшчэ больш азнаёмяць членаў партыі з сутнасцю рашэнняў пленума ЦК ВКП(б) і паслужаць адпраўным пунктам у перабудове партыйнай работы і ліквідацыі тых недахопаў, якія адзначаны ў рашэнні пленума ЦК ВКП(б).

Аб спыненні вядзеннем спраў аб пазбаўленні выбарчых правоў грамадзян СССР па матывах соцыяльнага паходжання, маёмаснага становішча і мінулай дзейнасці і аб ліквідацыі Цэнтральнай выбарчай камісіі ЦВК Саюза ССР

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА САЮЗА ССР

У адпаведнасці з арт. 135 Канстытуцыі Саюза ССР прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР **пастанаўляе:**

1. Усе справы аб аднаўленні ў выбарчых правах грамадзян СССР, пазбаўленых гэтых правоў па матывах соцыяльнага паходжання, маемаснага становішча і мінулай дзейнасці, вядзеннем спыніць.

Работу Цэнтральнай выбарчай камісіі ЦВК Саюза ССР лічыць закончанай і камісію распусціць.

2. Прыняць да ведама паведамленні ЦВК саюзных рэспублік аб ліквідацыі на месцах указаных камісій.

3. Даручыць СНК Саюза ССР у трохмесячны тэрмін унесці на зацвярджэнне ЦВК Саюза ССР праект пастановы аб змянах у законадаўстве Саюза ССР, выцякаючых з арт. 135 Канстытуцыі Саюза ССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
І. АКУЛАЎ.

Масква, Крэмль.
14 сакавіка 1937 г.

Аб рэарганізацыі судовых органаў у акругах

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

У адпаведнасці з арт. 80 Канстытуцыі БССР прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР **пастанаўляе:**

1. Рэарганізаваць пастаянныя судова-касацыйныя сесіі Вярхоўнага суда БССР у акругах у акруговыя суды.

2. Акруговыя суды ажыццяўляюць сваю дзейнасць на падставе пастановы ЦВК і СНК БССР за 25 студзеня 1936 года (З. З. БССР 1936 г., № 28, арт. 145).

3. Пастанову прэзідыума ЦВК БССР ад 15 верасня 1936 года (З. З. БССР 1936 года, № 28, арт. 148) скасаваць.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. ЛЯЎКОЎ.

КУДЫ НЕ ЗАГЛЯДАЕ НІХТО З НАРКОМАСВЕТЫ

За апошні час рэдакцыя «Звязды» атрымала некалькі пісем са школ Парыцкага раёна. У пісьмах прыводзіліся факты дрэннай работы асобных школ, адсутнасць кіраўніцтва імі, парушэнне пастаноў партыі і ўрада аб школе. Пры высвятленні на месцы большасць фактаў, прыведзеных аўтарамі пісем, пацвердзілася.

Майсееўская няпоўная сярэдняя школа — адна з аддалёных ад раённага цэнтра школ. У чалавека, упершыню наведаўшага яе, астаецца пяткае ўражанне. Будынак не дагледжаны, не абсталяваны. У класах холадна, тесна і няўтульна, голыя сцены, паламаныя старыя парты. Прышоўшы на заняткі, дзеці не распранаюцца, бо па карыдорах і класах гуляе вецер.

— Сродкаў няма, — апраўдваецца дырэктар школы Н. Плышэўскі.

У сапраўднасці-ж сродкі на абсталяванне ёсць, яны пераведзены сельсоветам на рахунак школы і нескарыстанне іх — віна самога дырэктара, які не клапоціцца, не хварэе за школу, і гэта вядзе да сумных вынікаў.

Работа школы на ніякім узроўні. Па асобных прадметах і класах процант непаспяховасці дасягае 20—30. За першае паўгоддзе школа мела 1323 дні вучнёўскіх прагулаў, пры наяўнасці ўсяго 199 вучняў. Высокая лічба прагулаў — просты доказ адсутнасці чулых адносін да дзяцей і пастаянных клопатаў аб іх з боку школы. Вучань 5 класа А. Савіч перастаў наведваць школу, і ніхто не пацікавіўся прычынамі. Паўтары месяцы не з'яўляецца на заняткі вучань 7 класа В. Царнацкі, і да гэтага нікому няма справы. У раёне гэтай школы да 10 дзяцей, падлягаючых абавязковаму навучанню, зусім не вучацца.

Па-за школай дзеці прадастаўлены самім сабе. Гэта становішча адразу выкарыстоўваецца варожымі элементамі на вёсцы. Зусім не выпадковы факты праяўлення антысавецкага настрою сярод асобных вучняў. Дагэтуль выхаваўчая работа з вучнямі не наладжана.

Недалёка ад Майсееўкі знаходзіцца вёска Кнышэвічы. У мінулым годзе тут пабудавана новая няпоўная сярэдняя школа. Але за кароткі час работы школа ўжо набыла сумную вядомасць. Узначальвае школу Кляпацкі — чалавек, які кампраметуе званне дырэктара совецкай школы. За сістэматычнае прыставанне да маладых настаўніц справа на Клепацкага перадана пракуратуры.

За Кляпацкім нямала выпадкаў паболю вучняў. Вучня 3 класа Галабурда Пётру Кляпацкі проста выштурхнуў з канцылярыі, вучня Яшу Бобрыка вылаяў і ўдарыў у карыдоры. У сваім самадурстве Кляпацкі пайшоў далей. Адноўчы ён загадаў настаўніцы Ржэвуцкай пайсці на вясковую вечарынку і пазбіраць шапкі з вучняў, якіх яна там убачыць. Абураючае распараджэнне Ржэвуцкая выканала: дзеці ішлі дамоў без шапак, і многія пазастужваліся.

Жонка дырэктара Т. Кляпацкая з'яўляецца рассадніцай склок і плётак, у школе сярод настаўнікаў пануе нездаровая атмасфера грызні, паклёпаў, кампраметацыі. Людзі займаюцца падсіджваннем, нагаворамі, сваркай, не жадаючы разумець, што гэтым яны не толькі падрываюць аўтарытэт совецкага настаўніка, але проста дзейнічаюць на карысць ворага.

Між тым з настаўнікаў школы чатыры комсамольцы — Селівончык, Байдак, Ржавуцкая, Харанека. Усе яны — маладыя настаўнікі, нядаўна скончыўшыя тэхнікумы і падрыхтоўчыя курсы. Яны павінны былі-б з'явіцца аздараўляючым ядром у школе, але, самі пагразшы ў склоках, яны не апраўдваюць сябе як комсамольцы.

Выхаваўчай работы з вучнямі не праводзіцца. Рэгулярна не працуе ні адзін вучнёўскі гурток. Нават такое мерапрыемства, як пушкінскі вечар, было сарвана. Адгэтуль зразумелы прычыны хуліганства сярод вучняў і нападанне іх пад уплыў нездаровага асяродзя на вёсцы.

Школай правалена навучанне дарослых. З 120 малапісьменных і непісьменных наведвае вячэрнюю школу не больш 10. І гэта ніколькі не турбуе настаўнікаў.

У Парыцкім раёне факты, прыведзеныя вышэй, не навіна. У Красноўскай няпоўнай сярэдняй школе дырэктарам працуе П. Пшанічны, раней зняты з працы ў другой школе, выключаны з партыі і судзімы за кражу. Пшанічны прытуліў у школе свайго прыяцеля, зусім непадрыхтаванага і непісьменнага настаўніка Міхалапа, паставіўшы яго выкладчыкам літаратуры і мовы. Міхалап вядомы на ўсю ваколіцу як п'яніца, за якім нямала антыграмадскіх учынкаў. Тут-жа разам з Міхалапам падвізаецца ў ролі настаўніка п'яніца Нырковіч. Школа—адна з адстаючых. У мінулым навучальным годзе скончыўшыя школу не маглі паступіць ні ў адну сярэднюю навучальную ўстанову, як непадрыхтаваныя.

Усяму гэтаму спрыяе работа загадчыка райана Рыбакова. Праязджаючы час ад часу па школах, Рыбакоў спакойна канстатаваў факты, патураючы віноўнікам дрэннай работы школ.

Райком партыі толькі за апошні час пасля візавочных фактаў агіднасцей заняўся школай.

І не толькі райкому партыі вядомы гэтыя факты, яны вядомы і Наркомасветы БССР. Парычы — аддалёны ад чыгункі раён, але гэта не апраўданне таму, што за два апошнія гады, па словах работнікаў райана і дырэктароў школ, ні адзін прадстаўнік з Наркомасветы не пацікавіўся на месцы работай школ Парыцкага раёна. Аб неадпаведнасці многіх дырэктароў школ Наркомасветы ведае, але ніякіх мер дагэтуль не прымае. Паведамленні райкома партыі, пісьмы настаўнікаў і скаргі, накіраваныя Наркомасветы, астаюцца без водгуку. А тым часам яўна непрыгодныя людзі прымазваюцца да школ.

Напружанае становішча з настаўніцкімі кадрамі, з работай раду школ Парыцкага раёна патрабуе неадкладнага ўмяшання Наркомасветы БССР.

Т. ХАДКЕВІЧ.

Зімовыя вучэнні ў часцях ВВА. НА ЗДЫМКУ: тэлефаністы тт. Дзікаў і Лобаў пля палявога тэлефона. Фото Я. Салавейчыка.

ПАКОНЧЫЦЬ З РАСХЛЯБАНАСЦЮ Ў ЦАГЕЛЬНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

З года ў год расце ў нас прамысловасць будаўнічых матэрыялаў. У 1936 годзе вытворчасць цэглы павялічылася ў параўнанні з 1935 г. на 94 проц. Аднак цэглы ўсё нехапае. У поўнай ступені гэта залежыць ад дрэннай работы цагельняў.

У мінулым годзе з прычыны адсутнасці цэглы прамысловасць БССР не скарыстала да 30 мільёнаў капіталаўкладанняў. Многія будоўлі пачалі атрымліваць цэглу толькі ў верасні. Снежань быў самым бурным месяцам у будаўніцтве. За ўвесь 1936 год цагельная прамысловасць недадала прадукцыі на 14,6 мільёнаў рублёў. Недавыканала свой план і вапнавая прамысловасць. Жасць цэглы выключна дрэнная.

Нарком мясцовай прамысловасці тав. Балцін у сваім дакладзе на ўсебеларускай нарадзе работнікаў прамысловасці будматэрыялаў прывёў рад фактаў агіднай работы многіх заводаў. На буйнейшым заводзе ў БССР — цагельні № 1 (Менск) гадавы план выкананы на 85 проц. Брак тут складае 80 проц. Завод № 3 (Менск) у студзені першага гатунку цэглы зусім не даў, другога гатунку даў толькі 22 проц., трэцяга — 45 проц., браку — 33 проц. Сярэдні сабекошт адной тысячы цэглы па БССР складае 76 руб. супроць плана 65 рублёў, а чарапіцы — 202 руб., замест 173 руб.

Сваю бяздзейнасць і няўменне працаваць многія гаспадарнікі апраўдвалі недахопам рабочай сілы. На справе-ж аказваецца, што заводы былі забяспечаны на 25 проц. лішнімі людзьмі. Адсюль фонд заработнай платы перавыдаткаваў на 1300 тысяч рублёў.

У 1937 годзе прамысловасці будматэрыялаў асігнавана 10,5 мільёнаў рублёў капіталаўкладанняў. Рост вытворчасці павялічыцца на 45 проц. у параўнанні з 1936 годам. Толькі завод № 1 павінен даць сёлета 55 мільёнаў штук цэглы. Гэта магельня аснашчана навейшай тэхнікай (блэкі-сушылкі, матавозы, экскаватары і інш.) і мае ўсё неабходнае для выканання плана.

На жаль, на гэтым заводзе больш агіднасцей, чым дзе-б там ні было. У лютым завод прастаяў 60 проц. рабочага часу. У студзені на ўчастку № 1 машыны прастойвалі больш, чым працавалі. Няправільна арганізавана распрацоўка кар'ераў, гліну капаюць не ўступамі, а здымаюць верхні пласт — самы топчы. Тут нават ухітрыліся зімой затапіць кар'ер. Проста шкодніцкая дзейнасць. Завод стаіць, а дырэктар Валасевіч п'янствуе.

Асаблівa востра стаіць пытанне аб падрыхтоўцы цагельнаў да новага сезона. На многіх заводах нехапае сродкаў для рамонту, нехапае сушыльнай плошчы, не абсталяваны інтэрнаты і сталовыя, не закончан рамонт і саміх заводаў. Такое становішча па віцебскім заводзе № 11, на аршанскім сілікатным, у Петрыкаве, на менскім заводзе № 3 і інш.

Стаханаўскі рух на цагельных заводах зусім слаба разгорнут. Дрэнная арганізацыя працы і расстаноўка людзей тармозіць павышэнне прадукцыйнасці працы.

Штогодняя механізацыя цагельнай вытворчасці вызваляе рабочых ад цяжкай ручной фізічнай працы, павышае прадукцыйнасць працы. Аднак ёсць рад гаспадарнікаў, якія ўсімі шляхамі стараюцца ўхіліцца ад механізацыі. К прыкладу можна прывесці выступленне на нарадзе дырэктара завода № 14 (Гомель) тав. Смалянскага, які «абасноўваў», што матавозы не прыгодны для цагельняў і іх трэба замяніць коньмі, як было раней. Гэтыя варожыя антымеханізатарскія тэндэнцыі не сустрэлі належнага адпору.

Памылкі мінулага года павінны быць улічаны ў далейшай рабоце. Між тым ужо зараз ёсць дрэнныя сігналы: за студзень і люты недадана 9 мільёнаў штук цэглы. Многія будоўлі знаходзяцца пад пагрозай спынення работ.

У бліжэйшыя тыдні пачнецца сезон. Задача цагельнікаў выключна вялікая. Ад іх залежыць нармальны ход будаўніцтва фабрычна-заводскіх карпусоў, сталінскіх школ, ясляў, радзільных дамоў. Уся грамадскасць рэспублікі пастолмна сочыць за іх работай. Так далей працаваць, як дагэтуль, немагчыма. Цагельная прамысловасць мае ўсё неабходнае для поўнага выканання плана 1937 года. Уся справа залежыць ад людзей, і толькі ад іх.

І. ТУРЭЦКІ.

У Кіраўскім раёне папіраюць совецкія законы

Чытаючы ў друку аб лепельскай справе, я хачу на старонках вашай газеты расказаць аб тых агіднасцях і парушэннях рэвалюцыйнай законнасці, якія маюць месца ў Паўлавіцкім і Грыбавецкім сельсоветах, Кіраўскага раёна. Яны, безумоўна, выклікаюць абурэнне ў грамадскасці, бо тут таксама папіраюць совецкія законы.

Калгас «Чалюскінец», Паўлавіцкага сельсавета выканаў і перавыканаў план па ільназагатоўках. Старшыня калгаса тав. Рыняк астачу трасты прадаў некаторым калгасам, а частку размеркаваў на прадпадні сваім калгаснікам. Але ў гэтым-жа сельсавеце былі яшчэ падобныя па ільну па некаторых калгасах. І вось старшыня сельсавета Гарлачоў знайшоў лёгкі выхад з гэтага становішча. Склаў брыгаду з старшыні калгасаў Вараб'ёва і Ермалаева і паехаў у калгас «Чалюскінец» здабываць лён.

Гарлачоў прапанаваў Рыняку неадкладна здаць ліпкі ільну. Рыняк яму катэгарычна ў гэтым адмовіў, заявіўшы: «На жаль, вы ўжо спазніліся, бо лён размеркаваны па прадпадніях». І параіў яму правесці масава-растлумачальную работу ў калгасе, абмеркаваць пытанне на агульным сходзе калгаснікаў, і кожны свядомы калгаснік прадасць свае ліпкі ільну. Але Гарлачоў не прывык праводзіць масавую работу, загадаў падагнаць яму дзве падводы і прыступіў да выканання сваіх «абавязкаў».

Брыгада на чале з Гарлачовым зрабіла пагалоўны вобыск ва ўсіх калгаснікаў. На пратэсты калгаснікаў не зварачалі ніякай увагі. Рыліся ў скрынях, на печы, на гары і ў ложках. Знойдзены лён забіралі і не складалі нават актаў.

Здзекі з боку Гарлачова над калгаснікамі не мелі ніякіх межаў. У сястры чырвонаармейца Марыі Манько былі замкнёны дзверы, але Гарлачоў вырваў прабой і ў адсутнасці яе забраў лён. Жонка брыгадзіра калгаса Тацяна Мацько не так хутка падала ключ ад скрыні. Гарлачоў адкрыў скрыню тапаром. Матка чырвонаармейца Акуліна Манько не з такой хуткасцю, як яму гэта хацелася, адчыніла свіран. Ён таксама ўзламаў дзверы. Калгаснікаў зняважвалі, лаялі.

Такімі-ж метадамі дзейнічае і старшыня Грыбавецкага сельсавета Мільто. Пачуўшы, што ў калгасе імя Лекерта ёсць лён, ён прапанаваў старшыні калгаса забраць у калгаснікаў лён. Але старшыня калгаса рашыў абмеркаваць гэта пытанне на агульным сходзе. Частка калгаснікаў згадзілася добраахвотна прадаць лён. Аднак, па думцы Мільто, продаж ішоў марудна. Ён нядоўга думаючы сабраў брыгаду і пайшоў рабіць вобыскі па ўсіх калгасных хатах. Тут таксама праводзіліся павальныя вобыскі. Бралі лён без актаў і грошай.

Не пагарджаў Мільто забіраць гатовыя прадметы нізкі, хамуты і іншыя рэчы. Да многіх калгаснікаў, якія прабавалі пярэчыць, «брыгада» прымала фізічныя меры ўздзеяння.

Нагласць Мільто дайшла да таго, што ў хаце калгаснікі Ганны Аксючэнкі, якая была тры дні пасля родаў, Мільто зрабіў вобыск і нават падняў раздзіху, шукаючы пад ёю лён. У калгасніка Жданавіча ў хаце былі толькі дзеці, там таксама шукалі лён.

Спадзяемся, што гэтыя унтэр-прышыбеевы будуць сурова пакараны пролетарскім судом.

А. К.

Грубае парушэнне Сталінскай Канстытуцыі

27 студзеня гэтага года стралачнік станцыі Свіслач, Беларускай чыгункі тав. Забаўскі папрасіў у суседа каня і паехаў у мяжуючы Віркаўскі сельсавет Клічаўскага раёна купіць для сябе бульбы. Недалёка ад вёскі Вірнаў старшыня гэтага сельсавета Букаты сустрэў Забаўскага і, падазраючы, што ён едзе на ўкрадзеным кані, беспадстаўна затрымаў яго і праз выкананўца накіраваў да свайго сакратара Сіняўскага ў сельсавет. Тут сельсаветчыкі пратрымалі т. Забаўскага 3 гадзіны і толькі па настойліваму патрабаванню прысутных у сельсавеце грамадзян адпусцілі яго.

Раённыя арганізацыі ведаюць аб падобных фактах парушэння Сталінскай Канстытуцыі, але маўкліва з гэтым згаджаюцца.

М. АЎТУХОВІЧ.

КЛІЧАЎ. (Ад спец. кар. «Звязды»). Пры праверцы на месцы вашым спецыяльным карэспандэнтам указаныя факты ў пісьме т. Аўтуховіча поўнасцю пацвердзіліся.

Тав. Забаўскі — стары рабочы ст. Свіслач. Аднаго разу ён папрасіў каня ў свайго суседа і паехаў купіць 3 пуды бульбы для сваіх уласных патраб. Калі т. Забаўскі вярнуўся дадому, яго спыніў незнаёмы, высокага росту чалавек.

— Ты куды едзеш? — грозна запытаў ён у Забаўскага.

— А вам што за справа? — адказаў той, не ведаючы, з кім ён размаўляе.

— Я старшыня сельсавета Букаты.— Заварачвай аглоблі і язджай у сельсавет.

Такім чынам, не разабраўшыся па сутнасці справы, Букаты беспадстаўна затрымлівае т. Забаўскага, падазывае да сябе выканаўца і накіроўвае яго ў сельсавет, а сам едзе кудысьці па сваіх справах.

Прысутныя грамадзяне ў сельсавеце толькі здзіўляліся: у чым справа? За што затрымалі знаёмага ім стралачніка? Што з ім будуць рабіць? Тав. Забаўскага тут пратрымалі тры гадзіны, а потым адпусцілі.

Аб усім гэтым ваш спецыяльны карэспандэнт азнаёміў старшыню Клічаўскага райвыканкома т. Найдуна, але ён роўнадушна аднёсся да гэтага і толькі паціснуў плячыма:

— Бачыш, тут напэўна ў стралачніка не аказалася пашпарта на каня.

Грубае парушэнне Сталінскай Канстытуцыі — не адзінкавы факт у гэтым сельсавеце. Нядаўна работнікі сельсавета ў калгасніка вёскі Лянаўка Пірожнікава Максіма зрабілі незаконнае адабранне маемасці. Цяпер Пірожніку частка маемасці звернута (свіння, карова), але забраныя аўчыны кімсьці з сельсаветчыкаў прысвоены.

У лютым старшыня сельсавета аднаго разу без прычыны напаў на возчыка торфу вёскі Люціна і пабіў ім павозкі.

Такіх фактаў можна было-б прывесці і больш, але дастаткова і гэтых, каб сказаць, што ў Віркаўскім сельсавеце грубае парушаюць Сталінскую Канстытуцыю і совецкія законы.

НАГЛЫ НАПАД НА СТАХАНАЎЦА

У вёсцы Кайкава, Менскага раёна, зроблен гнусны напад на лепшага стаханаўца тарфяной арцелі «Ударнік» т. А. Жгіроўскага. Калі т. Жгіроўскі зайшоў у краму сельпо, на яго накінуўся жыхар вёскі Кайкава А. Канапацкі і з крыкам «хопіць табе быць стаханаўцам» нанёс яму 2 нажавыя раны ў шыю і грудзі.

Тав. Жгіроўскі—лепшы тарфянік. Сваё сезоннае заданне ён у 1936 годзе выканаў на 216 проц., выразаўшы 10—14 тысяч торфаплітак пры нэрме 5600. За сезон ён зарабіў 2156 рублёў. Тав. Жгіроўскі быў некалькі разоў прэміраваны.

Наглы напад на стаханаўца не атрымаў належнай ацэнкі з боку праўлення торфарцелі, сельсавета, раённых арганізацый. Ніякіх мер супроць Канапацкага не прынята. Участковы інспектар міліцыі т. Курцоў, які быў у часе нападу ў вёсцы Кайкава, таксама не прыняў ніякіх мер.

Старшыня Менскага райвыканкома т. Жарын меў намер камандыраваць на месца начальніка міліцыі, але паслаў таго-ж інспектара Курцова. Канапацкі-ж сваімі хуліганскімі ўчынкамі тэрарызуе мясцовае насельніцтва. Канапацкаму старанна дапамагае былы старшыня арцелі «Ударнік» Гладкі.

ЕРМАКОЎ.

ЧЫГУНАЧНЫЯ БЮРАКРАТЫ

Увайшоўшы ў вагон, я заўважыў усяго некалькі чалавек, амаль усе месцы пуставалі. Такі-ж малюнак быў і ў іншых вагонах. Між тым большасць пасажыраў асталася на станцыі, бо начальнік станцыі аддаў загад не прадаваць білетаў. Бюракраты з чыгункі менш за ўсё клапоцяцца пра інтарэсы працоўных.

ВЯРБА.

УЗОРНА АБСЛУГОЎВАЦЬ ПАЗЫКАТРЫМАЛЬНІКАЎ

Б. САЎКОЎ

Начальнік Кіраўніцтва ашчадкас і дзяржкрэдыта НКФ БССР.

Дасягнутыя поспехі ва ўмацаванні совецкага рубля і ў развіцці дзяржаўных унутраных пазык зрабілі непатрэбным мінулы спяснялы парадак выдачы ссуд пад залог аблігацый толькі з дазволу камісій садзейнічання дзяржаўнаму крэдыту. Гэты парадак адменен, і з 1 сакавіка 1937 года ашчадныя касы прыступілі да бесперашкоднай выдачы ссуд пад залог аблігацый. Дэкрэт урада аб новым парадку выдачы ссуд з'яўляецца яшчэ адным яркім пацвярджаннем велізарных клопатаў партыі і ўрада аб совецкім народзе.

З кожным годам расце лік пазыкатрымальнікаў. На сёнешні дзень у СССР налічваецца 50 млн. трымальнікаў аблігацый. Гэта — паказчык высокай палітычнай свядомасці працоўных і няўхільнага ўздыму матэрыяльнага ўзроўню працоўных. 50 млн. трымальнікаў аблігацый унутраных пазык — яскравае праяўленне давер'я працоўных да цвёрдасці совецкага рубля і ўстойлівасці совецкіх фінансаў. Аблігацыя моцна ўвайшла ў совецкі быт.

Рашэнне ўрада аб канверсіі (абмене) аблігацый было спаткана шырокім падтрыманнем і поўным ухваленнем найшырэйшых мас працоўных. Яны добра зразумелі неабходнасць забеспячэння доўгатэрміновасці дзяржаўнага крэдыта для мэт фінансавання вялікага сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта тэрміновасць аснавана на поўнай добраахвотнасці.

Пазыкі ў нашай краіне пастаўлены на службу інтарэсам народу. Кожны трымальнік аблігацый дзяржаўных унутраных пазык добра ведае, што аблігацыі пазыкі гарантуюць яму надзейнае хаванне яго зберажэнняў.

Наша дзяржава з кожным годам выплачвае трымальнікам аблігацый даходы па пазыцы (выйгрышы і процанты) і намінальную каштоўнасць аблігацый усё мацнеючым рублём, што вельмі важна ва ўмовах няўхільнага зніжэння рознічных цэн у дзяржаўным і кааперацыйным гандлі і на калгасных рынках.

Дастаткова ўказаць, што за 1936 год агульнае зніжэнне рознічных цэн на прамысловыя і харчовыя тавары шырокага спажывання ва ўсім рознічным тавараабароце, уключаючы і калгасны рынак, складала 4,5—5 мільярдаў рублёў супроць цэн 1935 года. За 1935 год насельніцтва эканоміла ад зніжэння цэн ва ўсім рознічным тавараабароце каля 5 мільярдаў рублёў супроць цэн 1934 года.

Нашы гроші сталі даражэй. На іх можна зараз купіць больш прадуктаў харчавання. Калі ў 1934 годзе кілаграм жытняга хлеба каштаваў 2 рублі, то цяпер ён каштуе 85 кап., цукар у 1934 годзе каштаваў 12—15 рублёў, зараз ён каштуе 3 р. 80 к. — 4 р. 10 к. і т. д.

Вялікі правадыр народаў таварыш Сталін сказаў, што ўстойлівасць совецкай валюты забяспечваецца перш за ўсё велізарнай колькасцю таварных мас у руках дзяржавы, пускаемых у тавараабарот па ўстойлівых цэнах.

Штогодна расце тавараабарот у нашай краіне. У 1937 годзе тавараабарот дзяржаўных і кааперацыйных арганізацый, не лічачы калгасаў, складзе па плану 131 мільярд рублёў, або на 23,6 проц. вышэй 1936 года.

Не глядзячы на патаненне крэдыта ў СССР, выплачваемы нашай дзяржавай процант па пазыцы з'яўляецца найвышэйшым у параўнанні з радам капіталістычных краін (Англія, Францыя, ЗША і інш.).

Па пазыцы «Другая пяцігодка» (выпуск 4 года) штогодна будуць праводзіцца 4 тыражы выйгрышаў. Кожная аблігацыя, абавязкова выйграе на працягу тэрміну, на які выпушчана пазыка.

Першы тыраж пазыкі «Другой пяцігодкі» (выпуск 4 года) адбудзецца 25 мая г. г. у Маскве. У гэтым тыражы на кожныя 100 мільёнаў рублёў пазыкі будуць разыграны 5.000 выйгрышаў на суму 824.600 рублёў.

Выйгрышы ўстаноўлены ў 3.000, 1.000, 500, 200 і 150 рублёў на старублёвую аблігацыю, уключаючы намінальную вартасць аблігацыі.

Трэба шырока растлумачыць працоўным, што да пачатку першага тыража ўсе трымальнікі дзяржаўных пазык павінны абмяняць у сувязі з канверсіяй свае аблігацыі раней выпушчаных дзяржаўных пазык, а таксама атрымаць на рукі аблігацыі гэтай пазыкі па сваёй падпісцы 1936 года. Раздача аблігацый па падпісцы 1936 года будзе праводзіцца адначасова з выдачай зарплаты за другую палову красавіка бягучага года.

Згодна пастановы ўрада СССР аб выдачы ссуд пад залог аблігацый на час залога ў ашчадныя касы не прымаюць удзелу ў тыражах выйгрышу і ў атрымані процантаў. Закладзеныя аблігацыі не замацоўваюцца за трымальнікам аблігацый, а паступаюць у партфель ашчадкасы. Пры пагашэнні ссуды трымальнік аблігацый атрымлівае на роўную суму новыя аблігацыі з правам на ўдзел у далейшых тыражах выйгрышаў і на процанты.

Такім чынам, тыя пазыкатрымальнікі, якія не будуць мець на руках аблігацый і не пагасяць ссуды да пачатку тыража ў адпаведнасці з законам ад 20 ліпеня 1936 года, пазбаўляюцца магчымасці ўдзельнічаць у гэтым тыражы выйгрышаў. Напрыклад, калгаснік калгаса «Сталінскі набор» т. Лашук (Смалявіцкі раён) з'явілася ў райашчадкасу за атрыманнем ссуды. Хтосьці сказаў ёй, што калі яна не здасць аблігацый, то яны прападуць. Давераўшыся ў райашчадкасе, што гэта поўная хлусня, не маючы патрэбы ў грошах, т. Лашук не ўзяла ссуды, заявіўшы, што яна аблігацый не заложыць і будзе ўдзельнічаць у тыражы выйгрышаў.

Такія факты, якія сведчаць аб вялікай палітычнай свядомасці трымальнікаў аблігацый — не адзінкавыя.

Партыйныя і совецкія арганізацыі, профсаюзы, камсолы, работніцы фінорганаў і ашчадкас павінны правяць самую вострую большэвіцкую пільнасць, выкрываючы ворагаў народу, якія дыскрэдытуюць у якой-бы та ні было форме закон урада аб выдачы ссуд пад залог аблігацый.

Закон аб выдачы ссуд неабходна шырока папулярызаваць сярод працоўных. Трэба растлумачыць, што закон урада СССР аб выдачы ссуд пад залог аблігацый, — не часовы закон, а што ва ўсякі час кожны пазыкатрымальнік можа бесперашкодна ў выпадку патрэбы закласці свае аблігацыі.

У мэтах найлепшага абслугоўвання працоўных, ссуды пад залог аблігацый, апрача цэнтральных і раённых ашчадкас, выдаюцца ўсімі ашчадкасамі першага разраду і лепшымі ашчадкасамі другога разраду. Акрамя таго адкрываюцца дадатковыя пункты па выдачы ссуд з наборам дадатковых работнікаў. СНК БССР прапанаваў РВК прадаставіць ашчадкасам для гэтай мэты дадатковыя памяшканні. Для прыстасавання часу работы ашчадкас для лепшага абслугоўвання працоўных ашчадкасы праводзяць выдачу ссуд у дзве змены, пачынаючы работу з 8 гадзін раніцы.

Аднак, трэба адзначыць, што ў асобных раёнах райашчадкасы праяўляюць нераспаладчасць і нядбальны перабудзваць работу нахалу. Напрыклад, у Полацку да гэтага часу райашчадкаса не пашырыла дадатковую сетку пунктаў па выдачы ссуд, не прыцягнула да выдачы ссуд ні аднаго аддзялення другога разраду. У рэзультаце — бясконцыя чаргі ссудатрымальнікаў.

Новы парадак залога аблігацый ставіць перад ашчадкасамі вельмі адказныя задачы.

Ашчадкаса ўступіла ў непасрэдныя жывыя адносіны з кожным пазыкатрымальнікам, калі ў яго ўзнікае неадкладная патрэба закласці аблігацыі. Гэта патрабуе ад ашчадкас самых чулых адносін да атрымальнікаў ссуд.

Неабходна дабіцца хуткага абслугоўвання працоўных, не дапускаючы ні аднаго выпадку адмаўлення ад выдачы ссуды. Прыклад у гэтым павінны паказаць перадавыя людзі сістэмы ашчадкас — выдатнікі і выдатніцы.

Камсоды, якія вызвалены па закону ад былых сваіх функцый па выдачы дазволаў на заклад аблігацый, павінны ўсю сваю ўвагу пераключыць на правядзенне шырокай растлумачальнай работы сярод рабочых, служачых, калгаснікаў і працоўных адпаасобнікаў вакол закона аб выдачы ссуд. Не менш адказная роля ў папулярызацыі закона на прадпрыемствах і ва ўстановах клазеціна на профсаюзы.

Ашчадкасы дастаткова выраслі і арганізацыйна акрэплі. Гэта абавязвае ашчадкасы арганізаваць чоткае і культурнае абслугоўванне трымальнікаў аблігацый і ўкладчыкаў ашчадкас і стаць сапраўднымі культурнымі арганізатарамі народных зберажэнняў.

Закінуты ўчастак

(Пісьмо рабочых)

На раёне Арэса размешчаны два ўчастк беларускай раённай экскаватарнай станцыі. Рабочыя ўчасткі забыты і закі ны Белрэсам і раённымі арганізацыямі. Тут укаранілася безгаспадарчасць і шкодн тва, якія ўзначальвае былы дырэктар Арэса заядлы трацкіст Кірэеў.

Зараз на ніжнім участку (Глускі раён) з адсутнасці бронзавага ліцця і інш. абходных матэрыялаў зрываецца рамонт экскаватараў. Рамонт броневахт зусім не пачаты. Стаханаўскі рух тут інчаніца.

Палітычна-выхаваўчая работа і тэхнічн вучоба сярод рабочых не праводзяц

Амаль такое становішча і на верхнім стку (Любаньскі раён). Адміністрацыя торы (начальнік Верхаў, прараб Казаз) замест прыняцця адпаведных захаў займаецца пустой балбатнёй і абяцаннямі... «прымем меры», «уладзім спра» і т. д. І так праходзіць тыдзень, ме...

Просім «Звязду» ўмяшацца ў справы най канторы і дапамагчы арганізаваць мальную работу на ўчастках, каб у учым сезоне не паўтарылася мінула няя практыка.

ЯНУШКЕВІЧ, ТРУБОВІЧ, КОТАЎ, ЧЫГАК.

***

(Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»)

Факты, адзначаныя ў пісьме рабочых Янушкевіча, Трубовіча, Котава і Чы ка, пры праверцы на месцы поўнасцю пверзіліся.

На тэрыторыі Глускага і Любаньскага наў размешчаны два ўчасткі арэскай торы Беларускай раённай экскаватар станцыі (Белрэс). Сем экскаватараў гэтых участках выконвалі работы па уліроўцы ракі Арэсы.

Але гэту вялікую і адказную работу правальваюць.

Мінулагодні сезон на ўчастках прайшоў здавальняюча, але гэта нічаму не на ыла кіраўнікоў арэскай канторы. Падхтоўка да бягучага сезона ідзе вельмі ба. У канторы яшчэ і зараз не моць сказаць, дзе, на якім участку ракі цуць працаваць такія буйныя экскава ры, як «Марыён», «Менк-Гамбург» інш.

Рамонт экскаватара «Везер Мютэ» затнут па віне адміністрацыі канторы. ая не прадастаўляе неабходных матэ ялаў, як бронзавага ліцця і інш. Та і-ж тэмпамі на ніжнім участку раман цуць і астатнія экскаватары.

Яшчэ горшая справа на ўчастках з монтам броневахтаў. Тры броневахты трабуюць капітальнага рамонту. На гэта тупчана 21 тыс. руб., але ніхто не ыступіў да іх рамонту.

Стаханаўскі рух тут інпарусцца.

— Колькі стаханаўцаў? — запыталі ў начальніка канторы.

— Іх у нас цяпер няма, — адказаў рхаў.

Як не дзіўна, на ўчастках яшчэ дагэ рабочым аплачваюць не за здзельную работу, а пачасова. На ўчастках ць рад стаханаўцаў, добрых работнікаў, ія штодзённа перавыконваюць нормы працоўкі. Але пра іх маўчаць. Ніхто і не пікавіцца, не дапамагае ў рабоце.

На ўчастках панае запіс самакрытыкі. ута было машыністу экскаватара Менк-Гамбург» тав. Бабічэнку пакрытыкаваць начальніка канторы Верхава, як у трэба было неўзабаве пакінуць рату.

Трэба яшчэ дадаць, што на ўчастках здзвычай дрэнна пастаўлена снабжэнне бочых хлебам і прадуктамі. Перабоі ў одажы хлеба ўвайшлі ў сістэму.

Былы дырэктар Белрэса, заядлы трацст Кірэеў, разваліў усю работу на ўчаст ках арэскай канторы. Аднак новае кіраўцтва (дырэктар тав. Савіцкі) да гэтага часу ніякіх мер не прымала для ліквідацыі агіднай практыкі трацкіста Кірэева і ладжванні ўзорнай пастаноўкі работы рэскай канторы.

В. АСТРОЎСКІ.



Зімовыя вучэнні ў часцях БВА. НА ЗДЫМКУ: танк на выходным становішчы. Фото Я. Салавейчыка.

У ПРЫЁМНАЙ РАЙВЫКАНКОМА

У невялікім пакоі Чачэрскага райвыканкома стаіць 10—12 чалавек. Некаторыя з іх прыперліся да сталоў, пакурваюць цыгаркі і чытаюць пажаўцелыя старыя газеты, якімі пакрыты сталы. Да столі цягнуцца хмары дыму.

Падлога брудная, ніколі не мыта. Ні аднаго крэсла або лаўкі. Каля печы стаіць вядро, але няма кубка. Людзі бяруць вядро ў рукі і, нагнуўшы, п'юць, разліваючы ваду на ногі.

Кіраўнік спраў раённага выканаўчага камітэта т. Надтачэй прымае наведвальнікаў. Яго стол з усіх бакоў абкружылі калгаснікі. На стале параскіданы пратаколы і заявы. Папкі брудныя, абарваныя.

У Надтачэва заклопачаны выгляд. Ён абросшы барадою, у брудным паласатай матроскай майцы, уваткнуўся з галавой у паперы і не чуе, што да яго звяртаюцца.

— Тыдзень сем, як я падаў заяву, а мне няма адказу, — кажа калгаснік з Насімкаўскага сельсовета.

— Заяву? — пэрапытвае Надтачэй і пэрагортвае паперы на стале.

— Разгледзім. Чакайце, прышлём адказ, — кажа ён, і звяртаецца да другога наведвальніка. — А вы што хочаце?

Пакуль наведвальнік сабраўся расказаць аб сваёй справе, Надтачэва паклікалі. На стале асталіся ляжаць у тым-жа выглядзе заявы, пратаколы, дакументы. Наведвальнікі чакаюць дзесяць, дваццаць мінут. У пакоі адчыняюцца і зачыняюцца дзверы. Наведвальнікі на-хаду ловяць загадчыкаў аддзелаў. За планавіком Старавойтавым утварыўся цэлы хвост. Старавойтаў ідзе з аднаго пакоя ў другі, шукае вольнага стала, а за ім наведвальнікі.

І так увесь дзень. У палове чацвертай гадзіны работнікі райвыканкома замыкаюць шафы, звальваючы туды паперы. Наведвальнікі астаюцца і чакаюць невядома каго.

***

Інвалід Адамэнка з Дудзіч прыходзіць у райвыканком, як ён сам кажа, можа з дзюжын разоў. Прыходзіць да інспектара райсабеза т. Ткачука. Адаменка яшчэ 3 ліпеня мінулага года падаў Ткачуку заяву на атрыманне пенсіі. І калі-б ён ні прыходзіў, у райсабезе нікога не знаходзіць.

З Холацкага сельсовета часта ходзіць у райвыканком аднаасобнік Зайцаў Неспер. У яго сельсовет забраў цёлку і каня. Заява ляжыць неразабранай ужо другі месяц і яму заўсёды адказваюць:

— Пачакай, прышлем адказ...

У раённы выканаўчы камітэт кожны дзень звяртаюцца дзесяткі калгаснікаў і аднаасобнікаў. У аднаго сельсовет незаконна адабраў хатнія рэчы, у другіх жывёлу і інш. Напрыклад, у гр. Гуревіч Глыбочыцкі сельсовет забраў вопратку. Падобных скарг дзесяткі.

Але тут на скаргі працоўных не рэагуюць. Паказаная ў натуры прыёмная поўнасцю характарызуе стыль работы РВК. Няма патрэбы гаварыць аб якімнебудзь абслугоўванні працоўных. Няма не толькі раскладу гадзін прыёму, алэ і месца, дзе-б можна было пагаварыць з наведвальнікамі.

Скаргі ў райвыканкоме па месяцах ляжаць без рэагавання. У аднаго толькі Ткачука ляжыць 37 неразгледжаных заяў. Райфінаддзел марыную дзесяткі важнейшых заяў, якія гавораць аб масавых фактах парушэння рэволюцыйнай законнасці, грубым парушэнні Сталінскай Канстытуцыі.

Нават пасля зацвярджэння новай Сталінскай Канстытуцыі Чачэрскі райвыканком не перабудаваў сваёй работы. Ён цяжка здагадаецца як ацэняць выбарчыкі работу РВК пры новых выбарах.

А. ЛОСЬ.

НЕЗАКОННАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ПАЛЕСКАГА СЕЛЬСОВЕТА

(Пісьмо аднаасобніка)

У 1936 годзе я быў абкладзен сельгаспадатакам у суме 236 руб., страхавых узносаў я павінен быў унесці 77 руб. 17 кап. і па самаабкладанню — 141 руб 60 кап. Усяго, такім чынам, я павінен быў уплаціць 454 руб. 77 кап. Па зернавых культурах я павінен быў здаць дзяржаве 264 клг., ільнавалакна 24 клг. Па грашовых плацяжах я разлічыўся з дзяржавай поўнасцю, нават на 37 руб 26 кап. больш, чым належала, па збожжапастаўках таксама разлічыўся, а ільнавалакна перадаў 10 клг. 750 грам. І вось за гэта Палескі сельсовет (Чачэрскі раён) забраў усё, што ў мяне было: каня са збруяй, 2 свіней вагою на 5 пудоў кожная, пуню, амшань, аўчарнік, павець. Адзінае, што асталося ў мяне, гэта толькі хата.

— Я лічу, што сельсовет паступіў у адносінах да мяне незаконна і бяздушна. Гэта, між іншым, не ў першы раз. У верасні 1935 года сельсовет забраў у мяне карову за плацяжы, тэрмін якіх яшчэ далёка не прайшоў. Калі я прабаваў пратэставаць, мне адкрыта сказалі: «Нам патрэбны не грошы, а карова, улада належыць нам, што захочам, то і зробім». Карову забралі, а квітанцыі не выдалі.

Я сведамяюся, што праўда, нарэшце выплыве і вышэйшыя органы прымусяць сельсовет вярнуць усё, што ў мяне незаконна забралі.

Кузьма Аўсеевіч КАМІСАРАЎ.
Пасёлак «Пролетарый», Палескі сельсовет, Чачэрскага раёна.

АД РЭДАКЦЫІ: 10 сакавіка ў «Звязде» пісалася аб ігнараванні аднаасобнікаў, грубых парушэннях Сталінскай Канстытуцыі ў Чачэрскім раёне. Змяшчаемыя сёння пісьмы яшчэ раз пацвярджаюць, што ў Чачэрску незаконныя дзеянні ў адносінах да аднаасобнікаў — не адзінкавыя факты і што раённыя арганізацыі не сочаць за строгім выкананнем Сталінскай Канстытуцыі. «Звязда» чакае неадкладнага ўмяшання ў гэту справу пракуратуры рэспублікі. Вінаўныя ў грубым парушэнні совецкіх законаў павінны быць прыцягнуты да адказнасці.

Я. КОЛАС

СУЧАСНЫЯ КАЛІГУЛЫ

З глыбінь маны і ліхалецця
Пад ненавісніцтва разгул
Зноў усплыло людское смецце,
Імёны новых Калігул.

Даўно праклята гэта імя,
Ды не сышоўся свет у кліч:
Другая скула села ў Рыме,
І нрышч другі радзіў Бярлін.

Шалейце, Гітлер, Мусаліні!
Скідайце бомбы на Мадрыд!
Заллецца дуча ў гнойнай плыні,
Гапебна фюрэр будзе біт.

11.III 1937 г.

НЕБОЛЬШЭВІЦКІ СТЫЛЬ ПАРТЫЙНАГА КІРАЎНІЦТВА

У МТС Журавіцкага раёна доўгі час арудавалі ворагі народу. Трацкіст Макарэнка, шкоднік Шыла, антысеміты Андрэеў і Печкуроў, карыстаючыся прытупленнем большэвіцкай пільнасці і заціскам самакрытыкі ў партарганізацыі, тварылі свае шкодныя справы.

Так, шкоднік Шылаў свядома складаў шкодніцкія пасеўныя планы. Са строю выводзіліся трактары і т. д.

Калгаснікі неаднаразова сігналізавалі аб дзеяннях Шылава, але былы парторг Макарэнка не адзін раз выступаў і даказваў калгаснікам, што Шыла робіць вельмі карысную справу, што гэта самы лепшы спецыяліст. І гэта зразумела чаму. Макарэнка сам з'яўляўся актыўным трацкістам.

Усё гэта тварылася пад носам пярвічнай партарганізацыі. Больш таго, калі Макарэнка быў выкрыт паміма пярвічнай партарганізацыі, яму ўдаецца на партыйным сходзе працягнуць рэзалюцыі аб тым, што «Макарэнка не быў трацкістам і не падтрымліваў іх, а заўсёды з імі вёў барацьбу».

Прыведзеныя факты гавораць аб тым, што партарганізацыя МТС не зрабіла для сябе адпаведных высноў з праверкі і абмену партдакументаў і працэсаў над контррэволюцыйным трацкісцкім цэнтрам. Унутрыпартыйная дэмакратыя тут была зведзена на нішто. За адзін толькі год тут змянілася некалькі парторгаў і ні адзін з іх не адчуваўся на партсходзе аб сваёй рабоце. Комуністы не ўцягнуты ў актыўную партыйную работу.

Гэта пярвічная партарганізацыя не адзіная ў Журавіцкім раёне. Вось партарганізацыя хатаўнянскага вінзавода. Тут займаліся чым толькі хочаце, але не партыйна-выхаваўчай работай. Сярод стаханаўцаў і рабочых завода ніякай работы не праводзілася.

Прабраўшыяся сюды класава-варожыя элементы і на сёнешні дзень беспакарана праводзяць сваю шкодніцкую работу. У пачатку гэтага месяца на электрастанцыі была спалена дынамамашына. Бражныя трубы былі забіты жалезнымі пробкамі, праз якія некалькі тыдняў брага не магла пападаць на адкормачны пункт. У дэфлегматар (трубапровод спірта) былі ўкінуты пабочныя рэчы і ў выніку ён быў выведзен са строю. Аварыя на заводзе—звычайная з'ява.

Тэхнаруж Кабанчук, якога лічаць лепшым чалавекам на заводзе, на справе дапамагае шкоднікам. Ім былі зроблены заказы бракзільных чаноў. На два чаны формы «Элекс» затрачына больш трох тысяч рублёў, а яны аказаліся непрыгоднымі.

Дырэктар завода Арыстаў замест таго, каб выкрыць гэтыя шкодніцтвы, прыкрывае іх, груба заціскае самакрытыку. Калі на адным з рабочых сходаў у студзені выступіў тав. Макараў і пачаў выкрываць агіднае становішча на заводзе, то Арыстаў тут-жа пачаў яму пагражаць.

— Запішыце яго словы, сакратар, а потым мы з ім пагаворым, — ускрыкнуў Арыстаў. Ім быў зволен з работы без усякіх прычын лепшы стаханавец Шацаў, брыгадзір транспарту Лапухоў, які выступаў супроць Арыстава, некалькі разоў перакідваўся з адной работы на другую.

Пярвічная партарганізацыя (парторг тав. Кавалёў) праходзіла міма гэтых агідных фактаў.

Такое становішча і ў радзе іншых пярвічных партарганізацый.

Гэтыя факты сведчаць аб тым, што ўзровень унутрыпартыйнай работы ў раённай партыйнай арганізацыі нізкі.

11 лютага на сходзе райпартактыва стаяла пытанне аб становішчы пярвічнай партарганізацыі соўгаса «Чырвоны маяк». У гэтай партарганізацыі палітычны ўзровень комуністаў нізкі. Партарганізацыя не праводзіць ніякай палітвыхаваўчай работы сярод рабочых. У выніку ў гэтым соўгасе наглядаецца рад фактаў шкодніцтва: вялікі падзеж жывёлы, соўгас на 1936 год меў убытку больш ста тысяч рублёў. Адным словам, ворагі тут рабілі сваю справу беспакарана. Сярод рабочых з-за адсутнасці выхаваўчай работы заўважаюцца выпадкі хуліганства і п'янкі.

Абследаваўшы гэту партарганізацыю, член партыі тав. Палойка на сходзе заявіў, што «дрэннае становішча работы пярвічнай арганізацыі — гэта вынік адсутнасці кіраўніцтва райкома. Сакратар РК тав. Капэлянец, будучы неаднаразова ў гэтай арганізацыі не прыняў ніякіх мер у справе наладжвання партыйна-выхаваўчай работы і не дапамог гэтай арганізацыі».

Замест таго, каб усцярыняць правільна крытыку, сакратар райкома тав. Капэлянец назаўтра-ж пасля схода выклікае да сябе тав. Палойка і дае яму зразумець, што «работа райкома не падлягае крытыцы». Гэты факт не адзіны. Іх мноства ў раёне.

Вось чаму ў пярвічных партарганізацыях і на раённых партсходах няма разгорнутай самакрытыкі. Існуе крытыка па рангах. А там, дзе няма большэвіцкіх адносін да самакрытыкі, там, дзе заціскаюць самакрытыку, там ствараецца спрыяючая глеба для падхалімства. Гэта з усёй поўнасцю адчуваецца ў Журавіцкай партарганізацыі.

Райком парушае ўнутрыпартыйную дэмакратыю. Ёсць выпадкі, калі райком разглядае пытанні аб вынясенні партспагнанняў комуністам (Жукоўскі, Васілеўскі, Кандратаў), без таго, каб іх папярэдне абмеркаваць на пярвічных партарганізацыях.

Такі стыль работы райкома прывёў да таго, што ў радзе пярвічных партарганізацый рэволюцыйная пільнасць прытупілася, партыйная дысцыпліна аслабла, зніжан ідэйна-палітычны ўзровень унутрыпартыйнай работы, што садзейнічае работе класавага ворага.

У. КАЛЬМАГА.

ВОРАГІ АРУДУЮЦЬ ПАД БОКАМ РАЙКОМА КОМСАМОЛА

Пад бокам Варашылаўскага райкома комсамола (Менск) у арганізацыі Белпедтэхнікума доўгі час праводзіў антысовецкую дзейнасць студэнт Ігнатовіч. Палітычная блізарукасць комсамольскай арганізацыі выявілася ў тым, што яна не хутка выкрыла Ігнатовіча і справу аб ім скваліфікавала зусім спрошчана. З комсамола яго выключылі толькі за «ўтойванне соцыяльнага паходжання». Сакратар камітэта комсамола т. Мухля і дырэктар тэхнікума, член партыі т. Газэнбуш, не здолелі своечасова выкрыць Ігнатовіча, як заклятага ворага народу. Але Ігнатовіч не адзінкавы.

Адным з такіх яўна варожых элементаў у тэхнікуме з'яўляецца «комсамолец» Высеўка. Гэта ён быў адным з блізкіх прыяцеляў па антысовецкіх справах у тэхнікуме з Ігнатовічам. Гэта ён друкаваў у насценгазеце двурушніцкія артыкулы Ігнатовіча. Высеўка нават пасля агульнага схода студэнтаў па справе Ігнатовіча выступіў у абарону яго, рэзка абрушыўся на студэнтку Палеховіч, якая патрабавала неалкладнага выключэння Ігнатовіча з тэхнікума. Выступленне сумленнай студэнткі Высеўка назваў «агідным» толькі таму, што яна гаварыла на рускай мове, і патрабаваў прагнаць яе з трыбуны. Як і раней камітэт комсамола нічога не ўгледзіў у выступленні гэтага антысовецкага элемента. Контррэволюцыйны нацдэмаўскі твар Высеўкі з усёй паўнатой тут праявіўся. Але міма гэтага факту прайшла комсамольская арганізацыя. Высеўка знімаецца толькі з пасады адказнага рэдактара тэхнікумаўскай насценгазеты і атрымлівае вымову. Несумненна, што Высеўка па-ранейшаму працягвае свае антысовецкія справы, развальваючы працу і дысцыпліну ў совецкай навучальнай установе да апошніх дзён.

Выключную палітычную слепату ў выкрыцці Высеўкі праявіў член бюро гаркома комсамола Чучко, які выкладае Канстытуцыю і праводзіць палітзаняткі ў тэхнікуме. Гэта да яго некалькі тыдняў таму назад звяртаўся з контррэволюцыйным пытаннем Высеўка. Чучко абмежаваўся паведамленнем аб гэтым факце сакратару камітэта комсамола. А неабходна было-б іменна тут праявіць класавую пільнасць, аб якой Чучко не раз горача распінаўся на агульна-гарадскіх комсамольскіх актывах і сходах.

Наколькі комсамольская арганізацыя тэхнікума палітычна блізарукая сведчыць і яшчэ адзін вельмі павучальны факт. Застаючыся комсамольцам і студэнтам тэхнікума, М. Козіч і зараз спачувае гэтаму Ігнатовічу. Арганізацыя і на гэта не рэагуе, лічыць, што такія паводзіны комсамольца ёсць яго асабістыя справы... Не заўважылі ў тэхнікуме і тое, што студэнт Дарэўскі адкрыта праводзіць антысовецкую прапаганду, агітуе супроць калгаснага ладу.

Ці ведаюць аб усім гэтым у тэхнікуме члены партыі і комсамольцы? Ведаюць, але глядзяць на ўсё вачыма палітычных прастакоў. У тэхнікуме бывае і сакратар Варашылаўскага райкома комсамола т. Коган, але чым жыве арганізацыя і студэнты тэхнікума ён не цікавіўся. У інтэрнатах тэхнікума творацца агідныя справы, бескультур'е.

Пад бокам Варашылаўскага райкома комсамола знаходзіцца і другая комсамольская арганізацыя — электрастанцыі. Сакратар камітэта Вашкевіч ніякіх недахопаў у рабоце сваёй арганізацыі «не заўважае». З палітвучобай у яго «добра», з абаронай работай «лепш чым у мінулым годзе», а на справе далёка не ўсё ў парадку.

Не зусім даўно ў гэтай арганізацыі 4 комсамольцы адмовіліся выконваць працу, выступілі супроць новых норм, тлумачачы гэта тым, што «новыя нормы з'яўляюцца вынікам трацкісцкай дзейнасці» (?!) Такую заяву трэба было як мага хутчэй разгледзіць, высветліць ад куль яна ідзе. Гэтага, аднак, не было.

Пяладныя справы творацца ў некаторых арганізацыях комсамола Варашылаўскага раёна. А райком комсамола (сакратар Коган) працуе па-старынцы: засядаюць на бюро і нарадах, пішуць шматлікія рэзалюцыі аб пільнасці.

П. КАВАЛЁЎ.

ВОПЫТ МАЙСТРОЎ ВЫСОКІХ УРАДЖАЯЎ ІЛЬНУ

Пасля гістарычнай прамовы таварыша Сталіна на нарадзе камбайнераў і камбайнёрак аб зборы ў бліжэйшыя 3—4 гады —8 мільярдаў пудоў зярна ў год, а таксама пасля пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР ад 19 снежня 1935 г. «Аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў і ўзыме сельскай гаспадаркі ў абласцях, краях і рэспубліках нечорназемнай паласы» ў СССР, у тым ліку і ў БССР, шырока разгарнуўся стаханаўскі рух за высокі ўраджай ільну.

Цяпер, калі ў калгасах Беларусі разгортваецца барацьба за высокі ўраджай, 1937 годзе выключна важна папуляризаваць вопыт майстраў высокіх ураджаяў ільну ў 1936 г., каб гэты вопыт стаў набыткам шырокіх калгасных мас. На гэтай аснове мы здолеем вырасціць новыя тысячы майстраў стаханаўскіх ураджаяў перайсці ад асобных звенняў да суцэльных стаханаўскіх брыгад і калгасаў па барацьбе за рэкордны ўраджай ільну.

Падрыхтоўка да высокіх сталінскіх ураджаяў ільну 1936 г. у стаханаўскіх звенніх была пачата яшчэ восенню 1935 года. У зімовы час калгаснікі і калгасніцы, якія ўзялі на сябе абавязацельства трымаць высокі ўраджай ільну, сістэматычна збіралі попел і птушыны памёт. Гэты перыяд стаханаўскія звенні ўзмацнена павышалі сваю кваліфікацыю шляхам сістэматычнай агравучобы.

Стаханаўскія звенні праяўлялі выключныя клопаты аб ачыстцы насення ільну. Апрача машыннай ачысткі ва многіх звеннях, у мэтах дакладнай ачысткі насення, будавалася палатняная горка ВШПЛ. У масавых выпадках прымянялася палатковая ручная ачыстка на рашотах, на палатне і т. д. У большасці стаханаўскіх звенняў насенне ільну даводзілася да 99,5 проц. чыстаты, што павышала энергію прарастання іх. У час праўсёўнай эврацоўкі глебы многа ўвагі ўдзялялася барацьбе з пустазеллем шляхам выцягвання карнявішчаў пустазелля спружыноўкамі і наследуючым баранаваннем, выграбаннем карнявішчаў граблямі, якія зараз-жа ўдаляліся з поля. У 1936 годзе у стаханаўскіх звеннях у масавым маштабе прымянялася чыстасортнае селекцыйнае насенне ільну.

Як правіла, у стаханаўскіх ільняных звеннях ужываліся павышаныя дазіроўкі мінеральных угнаенняў. У дадатак да мінеральнага ўгнаення, у масавым маштабе прымяняўся попел, птушыны памёт, гноевая жыжа, а ў некаторых выпадках торфафекальныя кампосты ў колькасці 15—20 тон на гектар або торфагнаёвыя кампосты па 20—30 тон на гектар.

Новае ўнесена стаханаўскімі звеннямі і ў тэхніку пасеву ільну. Амаль ва ўсіх выпадках прымяняліся павышаныя нормы высеву ільну, прыкладна, 1,3—1,6 цэнтнера на гектар. Як пры раскідной, так і пры радковай сяўбе сяўба ільну рабілася крыж-на-крыж. Задзелка насення была неглыбокая—1,5—2,5 см. Многія калгасы ўжывалі спецыяльныя лёгкія бораны для задзелкі насення—калгас імя Калініна, «Авангард», «3 рашаючы». Лёнянскага раёна і інш. Догляд за ільном пачынаўся з першых-жа дзён пасля ўсходу.

У выніку стаханаўскай барацьбы за сталінскі ўраджай ільну, у 1936 годзе ў радзе калгасаў многімі стаханаўскімі звеннямі атрымана звыш 1 тоны ільнавалакна з гектара. Так, напрыклад, звяно Мінінай Екацерыны Фёдараўны ў калгасе «Май» Чачэрскага раёна, на плошчы 1,32 гектара атрымала 13,13 цэнтнера ільнавалакна і 7,5 цэнтнера насення ільну з гектара пры сярэднім нумары 17 і вышэйшым нумары 26. У звяне Мінінай лён высяваўся 25 красавіка на ўчастку пасля азімай шпаніцы і бульбы. Пад лён унесена 20 тон торфагною і 3 цэнтнеры калійнай солі.

Звеннявая Гаваркова Анастасія Сямёнаўна ў калгасе «Перамога» Шклоўскага раёна на плошчы 1 гектара атрымала 11,2 цэнтнера ільнавалакна пры сярэднім нумары 19 і вышэйшым 22. Лён у звяне Гаварковай высяваўся па лесавідным суглінку на акультураным участку пасля папярэднікаў—канапель і карнеплодаў, угноеных у 1935 годзе гноем. Першае аслоўнае ўзворванне рабілася восенню; прадпасеўнае ўзворванне заключалася ў веснавым пераворванні, пружынаванні і звычайным баранаванні. Пад лён унесена 3 цэнтнеры калійнай солі, 4 цэнтнеры суперфасфату і 6 цэнтнераў фосфарнай мукі. Сяўба праведзена радковай сеялкай крыж-на-крыж 21—22 красавіка пры норме высеву 1,5 цэнтнера на гектар. У перыяд росту лён палкармліваўся два разы: першы раз 20 бочкамі гнаёвай жыжы, разбаўленай у вадзе ў 5 разоў (100 бочак), а другі раз перал бутанізацыяй ільну з разліку 80 кілаграм аміячнай салітры на гектар.

У звяне Анны Максімаўны Бараўковай—калгас «10 з'езд Советаў». Лёнянскага раёна,—на лесавідным суглінку атрымана каля 1 тоны ільнавалакна на плошчы 1 гектара.

У радзе звенняў Чавускага раёна ў 1936 г. атрымана звыш 1 тоны ільнавалакна з гектара. Рэкордныя участкі па ільну ў Чавускім раёне ў сваёй большасці былі выбраны на звычайных землях у палях севазваротаў на суглінках і супесях. На рэкордных участках восенню і ў канцы жніўня праводзілася зяблівае глыбокае ворыва да 18—20 см. Прадпасеўная апрацоўка заключалася, галоўным чынам, у баранаванні, веснавым пераворванні, культывацыі з наслядоўным баранаваннем і далатковым ручным зграбаннем карнявішчаў пырніку. З угнаенняў пад лён уносіліся: 3—4 цэнтнеры суперфасфату або 10 цэнтнераў фасфарытнай мукі пры задзелцы пад плуг з далатковым унясеннем пад культывацыю 3—5 цэнтнераў размолатага птушынага памету і 3—5 цэнтнераў попелу. З калійных угнаенняў прымяняліся: калійная соль або хлорысты калій з разліку 2—3 цэнтнераў на гектар. Па іржышчу і бульбяншчу уносілася гнаёвая жыжа. Пасеў ільну загушчаны ручны або радковы крыж-на-крыж. Норма высеву 1,5—1,6 цэнтнера на гектар у перыяд ад 25 красавіка да 12 мая. У перыяд росту праведзена двух-і трохразовая праполка. Пры паяўленні ільняной блошкі лён пасыпаўся попелам у два перыяды, з разліку па 50 кілаграм на гектар. Як правіла, рабілася двухразовая падкормка. У якасці падкормкі уносілася па ўсходах гнаёвая жыжа, разбаўленая ў вадзе ў 4—5 разоў або птушыны памёт, які разбаўляўся ў вадзе ў 8 разоў.

Як аб гэтым сведчаць адзначаныя вышэй агратэхнічныя прыёмы, якія ўжываліся ў стаханаўскіх звеннях, галоўнейшым і рашаючым момантам у атрыманні сталінскага ўраджаю ільну з'яўлялася максімальнае і поўнае скарыстанне мясцовых угнаенняў, правільная арганізацыя працы на працягу ўсяго года барацьбы за ўраджай і ўжыванне правільных, навукова абгрунтаваных прыёмаў агратэхнікі. З агратэхнічных прыёмаў якія ўжываліся ў стаханаўскіх звеннях, асаблівай увагі заслугоўваюць яравізацыя, мульчыраванне, загушчаная сяўба і падкормка ільну ў час росту.

Такім чынам, стаханаўцы ільняных звенняў даказалі, што ва ўмовах БССР, ва ўмовах кожнага калгаса і соўгаса ёсць усе неабходныя прыродныя і гаспадарчыя ўмовы для атрымання сталінскага ўраджаю ільну.

У далейшай барацьбе за сталінскі ўраджай наша задача заключаецца ў тым, каб побач з атрыманнем яшчэ больш высокіх ураджаяў на рэкордных участках змагацца за сталінскі ўраджай на вялікіх плошчах у палях севазвароту. Зараз партыяй і ўрадам у барацьбе за сталінскі ўраджай пастаўлена задача: ад стаханаўскага звяна ісці да стаханаўскага калгаса і соўгаса, змагаючыся не толькі за рэкордны ўраджай на асобных участках, але і за рэкордны сталінскі ўраджай на ўсёй плошчы.

І. ВЛАСЕНКА.

Інстытут аграглебазнаўства і ўгнаенняў Акадэміі навук БССР.

ДВА МЕСЯЦЫ НЕ МАГУ ЎЗЯЦЦА НА ЎЧОТ

У сувязі з пераводам мяне на работу ў Асіпавіцкі раён я быў знят з учота ў Быхаўскім райкоме. Доўга прышлося чакаць пакуль Быхаўскі райком выслаў учотную картку. Тры разы я ездзіў у Асіпавіцкі райком за 40 кіламетраў, і ўсё не было ўчотнай карткі. Калі, нарэшце, прыбыла ўчотная картка, то толькі ў маёй прысутнасці выявілі, што сакратар Быхаўскага РК чамусьці не паставіў пячаткі ў картачцы аб зняцці мяне ў Быхаве з учота.

Учотная картка была адпраўлена для афармлення пячаткай. І вось ужо два месяцы не магу ўзяцца на ўчот толькі таму, што Быхаўскі РК не высылае маёй учотнай карткі.

Цяпер я не ведаю: — калі-ж мяне аформяць з прыняццем на ўчот?

РАДЗЬКО І. А.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

Крывавыя баі ў раёне Гвадалахары

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 13 сакавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе з Мадрыда:

«У раёне Гвадалахары (50 клм. на паўночны ўсход ад Мадрыда), каля трох гадзін дня, пасля пачатай зранку моцнай перастрэлкі, мяцежнікі прадпрынялі рашучую атаку. Пад прыкрыццём агнёвых заслонаў 32 магутныя танкі прасоўваліся да акопаў рэспубліканцаў. Рэспубліканцы аказвалі самае ўпартае супраціўленне. 4 разы мяцежнікі адпраўлялі свае атакі з ўсё узрастаючай сілай. 4 разы яны былі адкінуты. Рэспубліканская артылерыя дзейнічала вельмі паспяхова. Скарыстаўшы мінутнае замяшанне праціўніка, рэспубліканцы прадпрынялі ярасную атаку на левым флангу.

З наступленнем ночы ўсё яшчэ працягваліся гарачыя і крывапралітныя баі. У некаторых пунктах рэспубліканцы некалькі прасунулася ўперад. Сцвярджаюць, што за 4 дні баёў мяцежнікі страцілі тры тысячы чалавек забітымі і ранеными. На працягу дня 9 танкаў мяцежнікаў былі прывезены ў негоднасць ці знішчаны, а за час баёў у раёне Гвадалахары выведзены са строю 22 танкі мяцежнікаў».

Магутныя контратакі рэспубліканскіх войск

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 14 сакавіка. (БЕЛТА). Як перадае агенцтва Гавас, камітэт абароны Мадрыда апублікаваў учора ў поўдзень наступнае паведамленне:

«Атакі мяцежнікаў на фронце Гвадалахары прадаўжаюцца з ўсё ўзрастаючай сілай.

Учора раніцой праціўнік увёў у бой значныя людскія і матэрыяльныя рэзервы. Рэспубліканская армія, аказаўшы мяцежнікам гераічнае супраціўленне, прадпрыняла затым магутную контратаку, прымусіўшы праціўніка адступіць у раёне дарогі з Мадрыда к французскай граніцы. Пры гэтым перадавыя лініі рэспубліканцаў прыблізіліся да подступаў Трыхеке (на паўночны усход ад Гвадалахары). У часе гэтай аперацыі рэспубліканцы захапілі некалькі гармат, вялікую колькасць ваеннага снаряжэння і 9 італьянскіх палонных. Не глядзячы на неспрыяльнае надвор'е, рэспубліканская авіяцыя на працягу ўсяго дня з вялікай эфектыўнасцю салдзейнічала атакам ураўных войск. Звыш 500 бомб было скінута на лініі праціўніка на розных участках гвадалахарскага фронта».

У ваенарній зводцы камітэта абароны Мадрыда даворыцца:

«Сёння рэспубліканскія войскі мелі выключны поспех. На харамскім і гвадалахарскім Франтах (на паўночным і паўднёвым усходзе ад Мадрыда) мы не толькі ўзялі ініцыятыву ў свае рукі, але ў апошнія дні дабіліся надзвычай спрыяльных рэзультатаў. Намі ўзят Трыхеке (на паўночны ўсход ад Гвадалахары) і захвачена багацейшая ваенная здабыча: 12 гармат, 2 грузавікі з ваенным снаряжэннем, аўтаматычныя вінтоўкі, 60 кулямётаў, зенітныя гарматы, вялікая колькасць гранат і 2 грузавікі з харчаваннем. Захвачена таксама 18 палонных.

На харамскім фронце рэспубліканская артылерыя бамбардзіравала, скапленні мяцежнікаў, якія прабіваліся перайсці ў атаку».

Паказанні італьянскіх палонных, захопленых на Гвадалахарскім фронце

ПАРЫЖ, 13 сакавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Гавас, у Валенсію прыбылі італьянскія салдаты і афіцэры, захопленыя рэспубліканцамі ў палон у раёне Брыуэга на гвадалахарскім фронце. Палонныя былі дапытаны ў прысутнасці падпалкоўніка генеральнага штаба, чатырох французскіх і двух бельгійскіх дэпутатаў. Італьянскі афіцэр Сільвія заявіў, што ў Іспаніі былі высаджаны 80 тыс. рэгулярных італьянскіх войск. Паволле слоў Сільвія, на фронце Гвадалахары знаходзяцца 3 італьянскія дывізіі пад камандаваннем генерала Берганзолі, узначальваўшага матарызаваную дывізію, заняўшую Адыс-Абебу ў мінулым годзе. Першая італьянская дывізія на фронце Гвадалахары, вядомая пад назвай «літорыо», якая знаходзіцца пад камандаваннем генерала Манцыні, прыбыла ў Кадыкс 6 лютага на параходзе «Сіцылія». Гэта дывізія была адпраўлена ў Севілью, затым у Касерэс, Вальядолід, Альмасан, Арыса і, нарэшце, на гвадалахарскі фронт. Італьянскі афіцэр заявіў таксама, што гэта дывізія выехала з Італіі з усім ваенным снаряжэннем— са шматлікімі гарматамі, кулямётамі, агнямётамі і т. д.

Французская і бельгійская парламенцкія делегацыі апублікавалі паведамленне, у якім прыводзяцца паданёныя вышэй паказанні італьянскага афіцэра Сільвія. У паведамленні гаворыцца: «Мы маем, такім чынам, канчаткова і неабвержаны доказ апускання палітыкі неўмяшання. Перад намі не проста грамадзянская вайна, але гераічная барацьба ўсяго народу ў абарону цэласнасці сваёй тэрыторыі, якой пагражае іншаземнае ўтаржэнне. Германская і італьянская фашысцкія арміі захватваюць стратэгічныя пункты ў Іспаніі, займаюцца выпрабаваннем сваіх сродкаў вайны на пакутуючым іспанскім народзе, рыхтуючыся да таго, каб накіраваць гэтыя сродкі супроць усіх міралюбівых народаў Еўропы».

Французская і бельгійская парламенцкія делегацыі рашуча заклікаюць да салідарнасці з рэспубліканскай Іспаніяй. «Выратаваць рэспубліканскую Іспанію, гаворыцца ў заключенне, гэта значыць выратаваць усеагульны мір».

ПЕРАМОГА СОВЕЦКІХ ПІЯНІСТАЎ НА МІЖНАРОДНЫМ КОНКУРСЕ імя ШАПЕНА

ВАРШАВА (сталіца Польшчы), 13 сакавіка. (БЕЛТА). Трэці міжнародны конкурс піяністаў імя Шапена закончыўся поўнай перамогай совецкага музыкальнага мастацтва. Першая прэмія прэзідэнта польскай рэспублікі ў 5 тыс. злотых і дадатковая прэмія — лаўровы вянок з бронзы—прысуджаны совецкаму піяністу Якаву Заку; другая прэмія міністра асветы—2.500 злотых—совецкай піяністцы Розе Тамаркінай.

Совецкай піяністцы Таццяне Гольдфарб прысуджана дзевятая прэмія (500 злотых) —ад музыкальнай грамадскасці.

Піяністка Ніна Елельянава (СССР) атрымала ганаровы дыплом.

Якаву Заку журы конкурса прысудзіла яшчэ адну спецыяльную прэмію за найлепшае выкананне мазуркі—вылітую са срабра пасмертную маску Шапена.

Совецкім пераможцам конкурса—Заку і Тамаркінай—двухтысячная аўдыторыя наладзіла поўную захаплення авацыю.

Удзячнасць працоўных Іспаніі Совецкаму Саюзу. НА ЗДЫМКУ: агітканона мадрыдскай моладзі, якая збірае сярод насельніцтва сродкі на пабудову новага парахода «Комсамол», узамен затопленага фашысцкімі мяцежнікамі совецкага парахода «Комсамол». Надпіс на аўтамашыне, на якой змешчана мадэль цеплахода «Комсамол», заклікае: «За комсамол!». (СФ).

АДКРЫЎСЯ КАНГРЭС МІРУ І ДРУЖБЫ З СССР

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 13 сакавіка (БЕЛТА). Сёння ў Лондане адкрыўся другі кангрэс міру і дружбы з СССР. Прысутнічае звыш тысячы делегатаў, якія прадстаўляюць два мільёны членаў розных палітычных, грамадскіх і культурных арганізацый Англіі. У парадку дня кангрэса наступныя пытанні: 1) новая совецкая Канстытуцыя, 2) палітыка міру Совецкага Саюза. 3) культурнае развіццё СССР, 4) совецкая планавая гаспадарка. Кангрэсам атрымана шмат прывітанняў, у тым ліку ад Рамэн Ралана і іншых асоб.

На першым пасяджэнні абмяркоўвалася пытанне аб новай совецкай Канстытуцыі. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў паўпрэд СССР у Лондане тав. Майскі.

У спрэчках член парламента ліберал Дынгль Фут заявіў, што новая совецкая Канстытуцыя прадстаўляе сабой грандыёзны крок наперад у параўнанні з тым, што калі-небудзь раней ведала Расія. «Мы ў Англіі, — гаварыў далей Фут.— павінны вітаць гарантыю свабоды слова, а таксама недатыкальнасць асобы і жылля».

Старшыня арганізацыйнага Камітэта па скліканню кангрэса Лорд Лістоўэл адзначыў, што новая совецкая Канстытуцыя — адзіная канстытуцыя ў свеце, якая забяспечвае поўную эканамічную і палітычную свабоду (гэта заява была сустрэта бурнымі апладысментамі).

Делегат «Лігі барацьбы супроць імперыялізма» Брадлі падкрэсліў велізарнае значэнне роўнапраўя нацыянальнасцей у Совецкім Саюзе.

На вячэрнім пасяджэнні выступіў кансерватар член парламента Адамс, які заявіў, што СССР і Англія маюць шмат агульных інтарэсаў, з якіх важнейшыя з'яўляецца барацьба за мір. «Абодвум краінам,—гаварыў далей Адамс.—пагражае адна і тая-ж эканамічная дзяржава ў цэнтральнай Еўропе. З таго часу, як СССР уступіў у Лігу нацый, ён паказвае прыклад вернасці прынцыпам Лігі нацый». (Апладысменты).

САЮЗ ГІТЛЕР—ТРОЦКІ—ЯПОНСКІЯ ГЕНЕРАЛЫ

НЬЮ-ЙОРК, 13 сакавіка. (Уласны кар. «Праўды»). Грамадская думка ЗША пачынае ўсё больш распазнаваць сапраўдны твар Троцкага. Доказам таму можа служыць выступленне на жаночым кангрэсе ў Чыкага Ньютона Бекера, выдатнага дзеяча дэмакратычнай партыі, былога ваеннага міністра ў кабінеце Вільсона.

Бекер, гаворачы аб пагрозе міру, заявіў, што Троцкі ў загаворы з фашысцкімі дзяржавамі рабіў замах на ўсеагульны мір. Троцкі спадзяваўся, што загавор з Гітлерам і японскімі мілітарыстамі дасць ім перамогу над Совецкім Саюзам, а яму— ўладу. Троцкі,—сказаў Бекер,— прабаваў стварыць «новы трыумвірат з Гітлера, Троцкага і Японіі». Гэта было даказана на адкрытым судзе ў Маскве, дзе Радэк, Пятакоў і астатнія абвінавачваемыя прызналіся ў здрадніцтве.

Тут надаюць буйнае палітычнае значэнне выступленню Бекера, які карыстаецца вялікім аўтарытэтам у амерыканскіх грамадскіх колах. Ён даў характарыстыку здрадніку Троцкаму, яго гнуснай ролі на службе фашысцкіх агрэсараў, падпальшчыкаў вайны.

М. ОЛЬГІН.

Пазыка нацыянальнай абароны ва Францыі

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 13 сакавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Гавас, першы выпуск пазыкі нацыянальнай абароны (5 мільярдаў франкаў) быў пакрыт учора на працягу 8 гадзін пасля пачатку падпіскі.

Абвастрэнне супярэчнасцей у фашысцкім лагеры

ПРАГА (сталіца Чэхаславакіі), 13 сакавіка. (БЕЛТА). Газета «Народні освобозеніі» (орган чэшскіх легіянераў) пацвярджае весткі аб масавых арыштах членаў «СС» (фашысцкія ахоўныя атрады) у Мюнхене. Газета паведамляе аб абвастрэнні супярэчнасцей паміж кіраўніцтвам «СС», з аднаго боку і кіраўніцтвам рэйхсвера і морскага ваеннага флота—з другога.

Газета адзначае, што кіраўніцтва «СС» настойвала перад Гітлерам на адхіленні галоўнакамандуючага арміяй генерала Фрыча і начальніка генеральнага штаба генерала Бека. Толькі ў рэзультаце процідзеяння ваеннага міністра Блюмберга Бек не быў зволен.

ВЫДАТНЫЯ СПРАВЫ ЖАНЧЫН-АКТЫВІСТАК

У лёгкай прамысловасці БССР, як і ў іншых галінах народнай гаспадаркі, шырока развіўся выдатны рух жонак гаспадарнікаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў.

13—14 сакавіка ў Менску адбылася ўсебеларуская нарада старшынь саветаў, жанчын-камандзіраў вытворчасці, скліканай Наркомлегпромам БССР.

Жанчыны-грамадзянкі работнікі расказалі аб сваёй рабоце. У кожным іх выступленні адчуваецца вялікая адданасць сваёй справе, клопаты аб рабоце сваіх прадпрыемстваў.

Цікавым вопытам падзялілася тав. Соснер (Віцебск, панчошна-трыкатажная фабрыка «КІМ»). Жанчыны ўзялі шэфства над паасобнымі дамамі ў рабочым пасёлку і прывялі іх у культурны выгляд. Арганізавалі тры рукадзельныя гурткі, адзін — шыцця і кройкі, літаратурны гурток. Кожны дзень выдзяляюцца дзяжурныя ў бібліятэку і чытальню. На фабрыцы арганізаваны пакоі для дзяцей, дзе актывістка навучае іх музыцы. Дням адкрылі пакой для кармлення грудных дзяцей. Туды прыходзяць у часе абедзенага перапынку матэры з цэхаў і ў чыстых халатах кормяць сваіх дзяцей. У амбулаторыі арганізавалі кансультацыю для цяжарных. Пры кожным урачэбным габінеце дзяжурыць член совета.

Жанчыны-актывісткі адначасова і вучацца. На гэтай фабрыцы існуе гурток па бягучай палітыцы, у якім зараз вывучаюць Сталінскую Канстытуцыю. Тамсама праведзена вялікая абаронная работа. Многія хатнія гаспадыні здалі нормы на значок ГСА і ШХА.

Добра разгарнуў сваю работу совет жонак на шклозаводзе імя Сталіна (Касцюкоўка).

Тав. Іванова (Віцебскі ільнатрэст) расказала, як яны паставілі работу на ільназаводах.

Падзялілася сваімі ўражаннямі ўдзельніца ўсесаюзнай нарады жонак камандзіраў Чырвонай Арміі тав. Дадзіомава. Яна расказала аб вялікай, радаснай сустрэчы з любімым правадыром народаў таварышам Сталіным, аб рабоце жонак камандзіраў АБВШ.

Трэба адзначыць, што Наркомлегпром, які склікаў гэту нараду, зусім не падрыхтаваўся да яе. Характэрна тое, што за два дні, на вялікі сорам, ні адзін з кіраўнікоў наркамата не палічыў патрэбным наведаць нараду.

ПЕРАД ЛЕСАСПЛАВАМ

Атрыманы першыя паведамленні аб тым, што на Палессі пачалося ўскрыццё рэк. Так, у тураўскім сплаўным участку часткова ўскрыліся прытокі ракі Прыпяць—Свінавод і канал Крушыны. Вязка драўніны для пуску ў сплаў робіцца ўжо на вазе. У канцы сакавіка і першых чыслах красавіка чакаецца ўскрыццё ўсіх рэк БССР. Па свабодных водных магістралях пачнецца сплаў лесу за ўсе канцы краіны. З мільёны кубаметраў драўніны — такі план лесасплаву трэста Лесбел у 1937 годзе, з якіх 2858 тыс. кубаметраў нарыхтоўкі Наркамлеса.

У мінулыя гады па рэспубліцы было пяць сплаўных кантор. У гэтым годзе створаны 10 адміністрацыйных сплаўных дзінак: бабруйская, рагачоўская, мозырская і гомельская сплаўныя канторы і самастойна будуць сплаўляць лес полапкі, лепельскі, рэчыцкі, быліцкі, уздзенскі лесапрамгасы і віцебскі лесараён. Таксама намечана механізаваць рад прадпрыемстваў. Маторным флотам будзе праведзена перапяжка 1.200 тыс. кубаметраў драўніны на пад'ёмах і буксіроўка іх; механізмамі будзе сплочана 87 тыс. кубаметраў і пагружана дроў у баржы 175 тыс. кубаметраў. Будуюцца новыя плытапагрузачныя машыны, транспарцёры і дрованагрузальнікі.

Аднак, усе гэтыя мерапрыемствы не могуць забяспечыць поспех лесасплаву. Паказальнікі-ж ходу падрыхтоўкі да сплаўнога сезона нездавальняючыя. На 1 сакавіка падвезена да пунктаў сплаву толькі 1.170 тыс. кубаметраў лесу. План зімовай сплоткі выкананы на 35,8 процантаў. Рамонт флота на рагачоўскім і віцебскім участках выкананы на 45—50 проц. Рабочых замест 12915 чалавек завербавана пакуль 3780 чалавек.

Н. ГАСМАН.

ПАМЯЦІ А. М. ГОРКАГА

Беларускі Дом народнай творчасці разам з ЦСПСБ арганізуе з 15 сакавіка Усебеларускі конкурс на лепшую пастаноўку п'есы і лепшага чытальніка і выканаўца твораў А. М. Горкага. Конкурс будзе завершан да гадавіны са дня смерці вялікага пісьменніка.

Пытанне аб падрыхтоўцы да гэтай гадавіны абмяркоўвалася на спецыяльнай нарадзе клубных работнікаў Менска. Падрыхтоўчая работа праводзіцца на многіх прадпрыемствах. Тэатральны гурток клуба фабрыкі імя Кагановіча будзе ставіць п'есу «На дне». Радыёвузел фабрыкі арганізуе перадачы на матэрыяле А. М. Горкага.

ВЯСНА НА ПАЛЕССІ

МАЗЫР, 14 сакавіка. (Кар. «Звязды»). На Палессі стаіць цёплае надвор'е. Тэмпература паветра дасягае днём 6—7 градусаў цяпла. Імжыць дробны дождж. На палях ужо нябачна снегу. Веснавая вада шматлікімі ручаямі збягае ў Прыпяць. Узровень вады на рацэ з кожным днём павышаецца. У бліжэйшыя дні чакаецца лёдаход.

У гарадах, мястечках і калгасах, якія прылягаюць да берагоў Прыпяці, ідзе падрыхтоўка да сустрэчы паводкі. Умоцнена ахова мастоў. Прыводзяцца ў гатоўнасць лодкі. Вызначаны раёны, якім пагражае затапленне. Праводзіцца ачыстка берагоў ракі ад лесу і інш. груваў.

ФРАЛОЎ.

СУРОВА ПАКАРАЦЬ ВОРАГАЎ НАРОДУ

Рэдакцыя газеты «Звязда» атрымала з Масквы наступную тэлеграму: «У «Праўдзе» я прачытала хто забіў майго дзядзю Пэна. Апалеўшыя ад прагнасці звер-забойцы не толькі забойцы. Яны— палітычныя злачынцы, і совецкая ўлада, якая так клапаціцца аб вялікім мастаку, сурова пакарае іх як ворагаў народу. Іда Рубінштэйн».

НОВЫЯ ЧЭМПІЁНЫ

12 сакавіка ў клубе імя Сталіна ў Менску скончыліся спаборніцтвы па асабістае першынства БССР па барацьбе 1 штанзе.

Званне чэмпіёнаў БССР на штанзе заваявалі тт. Лапідус, Грыгаровіч, Шапіра, Масаловіч (Менск) і Башкіраў (Гомель). Першае месца па штанзе ў цяжкай вазе падзялілі менчанін Бланштэйн і гомельчанін Новікаў.

Па барацьбе чэмпіёнамі рэспублікі выйшлі тт. Бірг, Майзельс, Слоўшч, Сальнікаў, Мірскі (Менск), Прохараў (ВВА), Чуліцкі (Магілеў) і Афанасенка (Гомель).

ДВЕНІТЭ

Нарада ўсіх сакратароў парткомаў і парторгаў Варашылаўскага раёна скліканая 16 сакавіка г. г. у 8 гадзін вечара ў зале пасяджэння ЦСПОБ (Пляц Волі, Дом прасы). Яўка абавязкова.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1)
АПОШНІЯ
Абанемент № 57.

Гукавы кінотэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»
ДАРЫКО

Дзіцячы гукавы кінотэатр
ЮНАЦТВА ПАЭТА

Гукавы кінотэатр Пролетарый
АПОШНЯЯ НОЧ

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»
ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Гукавы кінотэатр «Спартак»
«КАЗНЬ»

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 15 САКАВІКА:
8-30 — «Апошнія паведамленні». 16 — п'еса «Бойтрэ». 17 — дзіцячая перадача. 18-30 — завочная партвучоба. 19-45 — яўрэйская музыка. 20-45 — выступленне артыстаў Дзяржаўнага операнага тэатра. 22 — канцэрт мастацкай самадзейнасці. 23 — «Апошнія паведамленні». 23-15 — перадача на польскай мове.

ПЕДГАБІНЕТ. Сёння ў 8 гадзін вечара АДБУДЗЕЦЦА
ЛЕКЦЫЯ
праф. М. К. ДАБРЫНІНА (Масква)
на тэму:
«Н. Г. ЧЭРНЫШЭЎСКІ як крытык».

Беларускаму кіраўніцтву песаахова і лесанасаджэнняў
патрабуюцца
для пастаяннай работы на перыферыі
ІНЖЫНЕРЫ па пясной гаспадарцы і лесакультурах,
УЧАСТКОВЫЯ ЛЯСНІЧЫЯ,
ЛЕСАТЭХНІКІ,
ЛЕСАУПАРАДКАВАЦЕЛІ — ТАКСАТАРЫ,
ПАМ. ТАКСАТАРЫ.
ЗАЯВЫ з прыкладаннем копіі працоўнага спіса прысылаць па адрасу: г. Менск, рог Комсамольскай і К. Маркса, 33/24, Лесаахова.

16 САКАВІКА, У 7 ГАДЗІН ВЕЧАРА,
У КЛУБЕ ІМЯ VII З'ЕЗДА ПРОФСАЮЗАЎ
(рог вул. Энгельса і Комуністычнай)
ЦЭНТРАЛЬНЫ СОВЕТ ПРОФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ І МЕНСКІ ГАРАДСКІ КАМІТЭТ МОПР
ПРАВОДЗЯЦЬ
ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ ВЕЧАР
ЖОНАК ІТР і СТАХАНАЎЦАЎ,
ПРЫСВЕЧАНЫ 66-й ГАДАВІНЕ ПАРЫЖСКАЙ КОМУНЫ — ДНЮ МОПР.
Пасля ўрачыстай часткі адбудзецца вялікі канцэрт.
Білеты на вечар рассылаюцца па ЦП саюзаў.
ЦСПСБ.
МЕНСКІ ГАРКОМ МОПР.

ЗАГАД № 32

Па менгарана ад 4 сакавіка 1937 г.

§ 1.

За добрую мастацка-музычную падрыхтоўку пастаноўкі казкі «О царе Салтане» па Пушкіну выхаванцамі дзіцячых дамоў г. Менска вынесці падзяку рэжысеру Дольскаму, артысту Аўштайну, балетмейстру Алексютовічу.

За чоткую арганізацыю ўсёй работы па падрыхтоўцы і афармленню пастаноўкі абвясціць падзяку інспектару дзіцячых дамоў Менгарана т. Сітэрман і калектыву работнікаў дзіцячых дамоў.

Загадчык Менгарана КУЗНЯЦОВА.

На падставе пастановы СНК БССР ад 9 сакавіка 1937 г. за № 520,
МЕНСКАЙ ГАРАДСКОЙ І НСПЕКТУРАЙ НАРГАСУЧОТА
(Горсовет, 52 пакой)
ПРАВОДЗІЦЦА
РЭГІСТРАЦЫЯ БУДАЎНІЦТВА
Усіх скончаных у 1936 годзе і пераходзячых аб'ектаў на 1937 год, а таксама аб'ектаў, знесеных у 1936 годзе.
Усе ўстановы, арганізацыі, прадпрыемствы і прыватныя асобы, якія праводзілі будаўніцтва ў 1936 г. і да гэтага часу не зарэгістравалі яго, павінны тэрмінова зарэгістраваць.
МЕНГОРІНСПЕКТУРА НАРГАСУЧОТА.

Адміністрацыя, МК і калектыў супрацоўнікаў трэста «Лесбел» выказваюць спачуванне супрацоўніцы трэста т. ГАНДЫШ з прычыны пасцігшага яе гора — смерці МАЦЕРЫ.

Работнікі Крычаўскага склада Белсельгасснаба выказваюць глыбокае спачуванне сям'і памёршага кіраўніка Белканторы Сельгасснаба
т. МАУШАНЗОНА Юлія Аронавіча.

НАРКОМУНТГАНДАЛЬ СССР
ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА
СТАЛОВЫХ, РЭСТАРАНАЎ і КАФЭ
«МОСНАРПИТ»
УСЯКАЕ БЛЮДА ГАТОВА
праз 10-15 мінут
КУПЛЯЮЧЫ НАШЫ КАНЦЭНТРАТЫ, ВЫ ЭКАНОМІЦЕ ЧАС і атрымліваеце смачны, пажыўны абед.

ЁСЦЬ Ў ПРОДАЖЫ
ПЕРШЫЯ, ДРУГІЯ І ТРЭЦІЯ БЛЮДЫ:
СУП-ПЮРЭ ГАРОХАВЫ,
КАША ГРЭЧНЕВАЯ,
ЛАПШЭЎНІК З МАЛАКОМ,
КІСЕЛЬ КЛЮКВЕНЫ,
І КІСЕЛЬ МАЛОЧНЫ.
КОЖНАЯ ТАБЛЕТКА Ў 100 гр.
утрымлівае канцэнтраванае гатовае блюда, згатаванае з лепшай па якасці натуральнай сыравіны.
ТАБЛЕТКА Ў 100 гр.
лёгка раствараецца ў кіпятку, і блюда гатова ў 10—15 мінут.
Спосаб прыгатаўлення ўказан на кожнай таблетцы
ПАТРАБУЙЦЕ ВА ЎСІХ ПРАДУКТОВЫХ МАГАЗІНАХ.
Даследчы завод харчовых канцэнтратаў Маскоўскага харчовага камбіната імя Мікаяна.
АДРАС: Москва, 1-й Переведеновский пер., д. 35.
Тэлефоны: Е-1-28-23; Е-1-10-61.

Да ведама ўрачоў і лекавых устаноў

ДАВОДЗЯЦЦА ДА ВЕДАМА ЎРАЧОЎ НАСТУПНЫЯ ВЫТРЫМКІ З ЗАГАДУ НК АХОВЫ ЗДАРОЎЯ СССР АД 2 СНЕЖНЯ 1936 г. ЗА № 120 АБ ПАРАДКУ ВОДПУСКУ З АПТЭК ЛЯКАРСТВАЎ, ЯКІЯ МАЮЦЬ ЯДАВІТЫЯ АБО МОЦНА ДЗЕЙНІЧАЮЧЫЯ СРОДКІ.

§ 5. Усе лякарствы, у саставу якіх уваходзяць ядавітыя або моцнадзейнічаючыя вяшчэствы (перце або ў суме сі), адпускаюцца з аптэк выключна па рацэптах урачоў.

У рацэптах, якія маюць ядавітыя або моцнадзейнічаючыя сродкі, урач абавязан указаць, апрача спосабаў ужывання і ўзросту хворага, калі хворы маладзей 18 год. або старэй 60 гадоў. Пры ўказанні спосабаў карыстання нельга абмяжоўвацца агульнымі выразамі: «наружнае», «унутранае», «ужываць як сказана» і т. д. Неабходна дакладна ўказаць частату прыёму і дозу (напрыклад: па 1 стал. лыжцы 4 разы ў суткі і т. д.).

§ 6. Лякарствы, якія маюць ядавітыя вяшчэствы, моцнадзейнічаючыя наркатычныя сродкі, дзігіталіс і яго прэпараты, не могуць быць адпушчаны з аптэкі паўторна без подпісу ўрача, калі на рацэпце няма надпісу ўрача «паўтараць без подпісу», або ўказання, колькі разоў паўтараць лякарствы без подпісу.

§ 7. Лякарствы, якія маюць моцнадзейнічаючыя вяшчэствы, за выключэннем указаных у § 6, калі яны прапісаны ў дозе менш палавіны вышэйшага аднаразовага прыёму, могуць быць адпушчаны паўторна без подпісу ўрача на рацэпце (сігнатуры), калі на рацэпце няма з боку ўрача спецыяльных указанняў аб недапушчальнасці паўтарэння гэтых лякарстваў.

§ 13. На рацэптах, якія маюць наркатычныя прэпараты: морфій, опій, опійная настойка і экстракт, героін, дзіанін, пантапон, какаін, як у чыстым выглядзе, так і ў сумесі, павінна быць апрача подпісу ўрача таксама асабістая пячатка ўрача або ўстановы, якой ён працуе.

КАБ ПАЗБЕГНУЦЬ НЕПАРАЗУМЕННЯЎ, ЯКІЯ МОГУЦЬ МЕЦЬ МЕСЦА ПРЫ ЗАКАЗАХ У АПТЭКАХ ЛЯКАРСТВАЎ ПА РАЦЭПТАХ, У ЯКІХ НЕ ЗАХАВАНЫ ЎСТАНОЎЛЕНЫЯ ПРАВІЛЫ ПРАПІСВАННЯ ЯДАВІТЫХ І МОЦНАДЗЕЙНІЧАЮЧЫХ ВЯШЧЭСТВАЎ, УРАЧАМ НЕАБХОДНА ДАКЛАДНА ПРЫТРЫМЛІВАЦЦА ЎКАЗАНЫХ ПРАВІЛ, А ТАКСАМА ТЭКСТ РАЦЭПТА І ПОДПІС ПАВІННЫ БЫЦЬ РАЗБОРЛІВЫ, УЛІЧВАЮЧЫ, ШТО АПТЭКАМ ДАНО КАТЭГАРЫЧНАЕ ЎКАЗАННЕ — ЛЯКАРСТВЫ ПА НЯПРАВІЛЬНА АФОРМЛЕНЫХ РАЦЭПТАХ НЕ АДПУСКАЦЬ.

БЕЛАПТЭКАКІРАЎНІЦТВА.

НА ПАДСТАВЕ ЗАГАДА НКУТ БССР ЗА № 202
БЕЛПЛОДГАРОДГАНДАЛЬ
ЛІКВІДУЕЦЦА.
УСЕ АРГАНІЗАЦЫІ І АСОБЫ, ЯКІЯ МАЮЦЬ ПРЭТЭНЗІІ, ПАВІННЫ ПРАД'ЯВІЦЬ ІХ НЕ ПАЗНЕЙ 1 КРАСАВІКА 1937 года ПА АДРАСУ: г. МЕНСК, СОВЕЦКАЯ, 46.
ЛІКВІДКОМ.

Уп. Галоўлітбела № К—590. Друкарня газеты «Звязда». Менск, Совецкая, 63. К., К., С.